Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЛІПЕНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 134
(26492)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Шматдзетным сем'ям Мінска выдзяляць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва

Шматдзетным сем'ям Мінска, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, да 15 жніўня выдзяляць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва індывідуальных дамоў. Такое даручэнне адпаведным гарадскім службам даў выканаўца абавязкаў старшыні Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на аператыўнай нарадзе.

Паводле слоў **начальніка аддзела пісьмаў і прыёму грамадзян гарвыканкама Марыны МАКОЎСКАЙ,** за першае паўгоддзе гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008-га колькасць зваротаў шматдзетных сем'яў па пытанні выдзялення зямельных участкаў для будаўніцтва аднакватэрных дамоў вырасла амаль удвая — з 35 да 69. Начальнік управлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Мікалай Ком далажыў, што ўжо вызначаны 63 участкі, якія будуць перададзены шматдзетным сем'ям, якія стаяць у чарзе, для будаўніцтва аднакватэрных дамоў. Пералік з указаннем месцаў размяшчэння ўчасткаў у найбліжэйшы час будзе накіраваны ў адміністрацыі раёнаў. Яны паведамяць сем'ям аб прапанове зямельнага ўчастка. На працягу 10 каляндарных дзён грамадзяне павінны прыняць рашэнне, пасля чаго афармляецца дакументацыя.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ КДК І ПАДЛІКОВАЙ ПАЛАТЫ ЎМАЦОЎВАЕ АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Актыўнае ўзаемадзеянне і канструктыўны дыялог паміж Камітэтам дзяржаўнага кантролю Беларусі і Падліковай палатай Расіі стварае трывалы фундамент для пашырэння і паглыблення ўзаемавыгаднага беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Упэўненасць у гэтым выказаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з кіраўніком расійскага кантрольнага ведамства Сяргеем Сцяпашыным.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Мы заўсёды былі і будзем разам. І таму работы ў КДК і Падліковай палаты на перспектыву вельмі многа. Я ўпэўнены, што яе будзе яшчэ больш». У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка заклікае не верыць распускаемым у некаторых СМІ чуткам і інсінуацыям аб адыходзе Беларусі ад Расіі.

«Мы ніколі не адыдзем ад Расіі, гэтак жа як Расія ніколі не пакіне нас, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Усё, што ў СМІ пішуць наконт гэтага, — поўная хлусня і наўмыснае скажэнне фактаў па любой, нават самай нязначнай падставе, не кажучы ўжо аб эканамічных і палітычных адносінах паміж Беларуссю і Расіяй». «Гэта антынароднае лобі, якое актывізавалася ў Расіі і ў нас», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што паміж КДК і Падліковай палатай усталяваліся вельмі добрыя адносіны. Станоўчы вынік прынёс сумесны кантроль Падліковай палаты Расіі і Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі за выкананнем бюджэту Саюзнай дзяржавы.

«Мы даўно ўзялі за правіла, што два кантрольныя ведамствы Саюзнай дзяржавы павінны сачыць за выкананнем саюзнага бюджэту. Ваша першае ўмяшанне ў пытанні яго расходавання дало станоўчыя вынікі. Думаю, што трата грошай з саюзнага бюджэту можа быць узорам расходавання грашовых сродкаў для любой дзяржавы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Сяргей Сцяпашын у сваю чаргу падкрэсліў, што ў Падліковай палаты Расіі і Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі няма ніякіх тайнаў адзін ад аднаго. «Нягледзячы на ўсе перапетыі жыцця дзяржаў, паміж нашымі ведамствамі заўсёды былі цудоўныя адносіны», — сказаў госць.

Сяргей Сцяпашын таксама праінфармаваў аб правядзенні ў Мінску сумеснай калегіі КДК Беларусі і Падліковай палаты РФ.

У ходзе сустрэчы было закранута пытанне абмежаванняў на пастаўкі беларускай малочнай прадукцыі ў Расію. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў госцю навесці любое малакаперапрацоўчае прадпрыемства краіны і ацаніць яго прадукцыю. Адразу пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Сяргей Сцяпашын разам са старшынёй КДК Беларусі Зянонам Ломацем адправіўся на Мінскі гарадскі малочны завод № 1. Прадэгуставаўшы малочныя прадукты гармалзавода, госць ацаніў іх выдатны смак і якасць: «Гэта ўнікальныя, вельмі карысныя і смачныя прадукты. Не сакрэт, што расіяне заўсёды з пietэтам ставіліся да беларускай малочнай прадукцыі, якая спалучае высокую якасць з прымальнай цаной».

Сяргей Сцяпашын перакананы, што ў аснове так званай малочнай спрэчкі паміж Расіяй і Беларуссю, хутчэй за ўсё, ляжыць недастатковае ўзаемаразуменне. Паводле слоў старшыні Падліковай палаты, вярнуўшыся ў Маскву, ён разбярэцца з тым, якія прэтэнзіі ёсць у расійскага боку і якім чынам іх можна зняць канчаткова. «Я парэкамендую галоўнаму санітарнаму ўрачу Расіі Генадзю Анішчанку, каб ён прыехаў сюды і разабраўся, — сказаў Сяргей Сцяпашын. — На мой погляд, важна выходзіць з дзвюх пазіцый: па-першае, якасны прадукт павінен даходзіць бесперашкодна да стала расіян, а па-другое, навошта караць мясцовага вытворцу».

«Мы дамовіліся з Аляксандрам Рыгоравічам, што ўсе пытанні павінны здымацца на ўзроўні спецыялістаў», — адзначыў госць.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗВОНКАЯ, ЧЫСТАЯ, НЕВЫЧЭРПНАЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паміж прысядзібных участкаў ў г.п. Лёзна шмат гадоў бруіцца крынічка. Аздобленая і ўпарадкаваная жыхарамі пасёлка, цяпер яна з'яўляецца любімым месцам лёзненцаў. 11-гадовая ***Юлія ХОЦЬКІНА*** *(на фотаздымку) жыве за некалькі крокаў ад гэтай асвечанай і звонкай крыніцы.*

У ЛЕС ПА ГРОШЫ

Чарніцы і лісічкі — актуальныя лідары сезона нарыхтовак. Ім складаюць канкурэнцыю парэчкі з сельскіх сядзібаў

Пачынаючы з гэтага тыдня, Магілёўскі аблспажыўсаюз падняў цэны на чарніцы. Калі да апошняга часу **за кілаграм чарніц** людзям плацілі 3,5 тысячы рублёў, то з гэтага тыдня — **3700—4000 рублёў.** Такім чынам спажывецкія таварыствы спадзяюцца павялічыць аб'ём нарыхтовак чарніц: сёння ён не дацягвае да леташняга ўзроўню амаль на сотню тон.

Праўда, спецыялісты па нарыхтоўках на гэты конт не хвалююцца. На сёлетнюю нарыхтоўчую кампанію паўплывала надвор'е, і яна пачалася на два тыдні пазней.

Камбінацыя спякоты з моцнымі дажджамі не лепшым чынам адбілася на якасці ягады, якую і цяпер то паліць сонца, то залівае вадой. Таму чарніцы сёлетняга ўраджаю не дацягваюць да класа «А» паводле еўрапейскіх стандартаў. А менавіта на рынках Заходняй Еўропы актыўна набываюць беларускія чарніцы — 99% ад усяго сабранага ўраджаю, прынамсі на Магілёўшчыне.

Акрамя надвор'я, на сітуацыю паўплываў і крызіс: попыт на чарніцы па-ранейшаму ёсць, але цэны ўпалі. І калі летась за кілаграм чарніц еўрапейскія прадпрымальнікі плацілі 2,3 еўра, то ў гэтым сезоне — не болей за 1,4-1,5 еўра. У Беларусі цэны на чарніцы засталіся на леташнім узроўні, хоць пры пераліку на валюту і яны знізіліся.

— За чарніцы, лісічкі і ўсю іншую прадукцыю ў сельскіх крамах і нарыхтоўчых пунктах на рынках жывыя грошы плацяць адразу, без адтэрміновак, — запэўніў **начальнік упраўлення нарыхтовак аблспажыўсаюза Аляксандр УТКІН.** — Хоць дзеля гэтага нам даводзіцца адцягваць уласныя сродкі арганізацыі. Летась на гэтую пару мы мелі крэдыт на нарыхтоўкі, а сёлета яго пакуль няма.

Аднак, нягледзячы на крызіс, агульны нарыхтоўчы абарот Магілёўскага аблспажыўсаюза перавысіў за паўгода 116 % у параўнанні з леташнім паказчыкам. За паўгода за сельскагаспадарчую прадукцыю і сыравіну спажывецкія таварыствы выплацілі людзям 5,8 мільярда рублёў.

Так што сезон нарыхтовак — гэта рэальная магчымасць зарабіць, папоўніць сямейны бюджэт.

Ёсць выпадкі, калі нават жыхары сталіцы бяруць адпачынак і прыязджаюць у сельскую мясцовасць у час нарыхтоўчай кампаніі. Такія людзі ёсць на Асіповіччыне, багатай на лясныя дарункі і чыстай ад радыяцыі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ ЭФЕКТЫЎНАЙ ДЭБЮРАКРАТЫЗАЦЫІ?

Галоўнае, што ўскладняе працэс дэбюракратызацыі дзяржаўных органаў Беларусі — недастатковая інфармаванасць грамадзян аб сваіх правах. Такія вынікі сацыялагічнага даследавання, праведзенага інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Разам з тым за апошнія два гады ўдзельная вага рэспандэнтаў, якія адзначылі гэтую праблему, значна зменшылася (з 57 да 39 працэнтаў). Таксама, паводле меркавання ўдзельнікаў апытання, далейшай дэбюракратызацыі перашкаджае слабы кантроль за ходам выканання заканадаўства на месцах — гэта адзначылі 32,1 працэнта рэспандэнтаў. Сярод іншага ўдзельнікі апытання называлі адсутнасць належных мераў па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур, неэфектыўнасць сістэмы электроннага дакументазвароту.

ПРЫЧЫНЫ, ЯКІЯ ЎСКЛАДНЯЮЦЬ ДЭБЮРАКРАТЫЗАЦЫЮ ДЗЯРЖАПАРАТУ
(у % ад колькасці апытаных)



1. Недастатковая інфармаванасць грамадзян пра свае правы.
2. Слабы кантроль за тым, як на месцах выкарыстоўваюцца заканадаўчыя акты.
3. Не робяцца належныя захады для спрашчэння адміністрацыйных працэдур.
4. Няўменне ці нежаданне чыноўнікаў працаваць з насельніцтвам.
5. Адсутнасць ці неэфектыўнасць сістэмы электроннага дакументазвароту.
6. Нізкі ўзровень кваліфікацыі і кампетэнтнасці работнікаў, якія ажыццяўляюць прыём грамадзян.

Пэўныя перашкоды ў працэсе дэбюракратызацыі ствараюць і асабова-дзелавыя якасці чыноўнікаў: няўменне ці нежаданне працаваць з насельніцтвам, нізкі ўзровень кваліфікацыі і кампетэнтнасці. Жыхары сталіцы называюць гэтыя аспекты значна часцей — 55,2 працэнта апытаных.

Удзельнікі апытання адзначылі, што ім больш за ўсё не хапае ўважлівага і паважлівага стаўлення з боку чыноўнікаў, і паралелі ўдасканаліць арганізацыйна-прававую базу работы з грамадзянамі: павысіць аператыўнасць вырашэння пытанняў, зменшыць дакументазварот, зрабіць больш жорсткім кантроль за работай чыноўнікаў, увесці папярэдні запіс і г. д.

Ул. інф.

ХТО ПАПАЛЮЕ ПАД ВАДОЙ?

Спробу незаконнага перавозу буйной партыі тавару спынілі супрацоўнікі Ашмянскай мытні — пра гэта паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Увагу мытнікаў прыцягнуў аўтамабіль «ДАФ», які рухаўся з Літвы ў Расію з партыяй спартыўнага інвентару. Падчас афармлення тавару было заўважана, што яго рэальная вага перавышае заяўленую амаль на чвэрць. У выніку з'явілася рашэнне правесці агляд транспартнага сродку, падчас якога ў грузавым адсеку аўто былі знойдзены незадэклараваныя 1800 стрэльбаў для падводнага палявання, 86 адзінак камплектавых частак да стрэльбаў, 1740 гарпуноў, 890 спецыяльных нажоў для падводнага палявання, наборы сталовых нажоў, 48 змяшальнікаў, 30 дазатараў, 31 сушылка для рук, а таксама металічныя скрыні. Прычым ацэначны кошт кантрабанды ўражвае — больш за 1,1 мільярда рублёў. Цяпер незадэклараваныя тавары канфіскаваныя. Па гэтым факце распачаўся адміністрацыйны працэс.

Сяргей ГРЫБ.

ЗЛАШЧАСНАЯ «БАЛГАРКА»

У в. Беражное Столінскага раёна быў смяротна траўмаваны мужчына. Жыхар в. Дубінец на будаўніцтве дома працаваў з «балгаркай». Калі ён адключаў інструмент, яго ўдарыла токам.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЛАБААЛКАГОЛЬНЫЯ НАПОІ АБ'ЯВЯЦЬ ПА-ЗА ЗАКОНАМ?

Міністэрства гандлю Беларусі падрыхтавала прапанову ва Урад аб забароне вытворчасці і продажы на тэрыторыі нашай краіны слабаалкагольных напояў. Пра гэта ўчора паведаміў журналістам першы намеснік міністра гандлю Міхаіл СВЯНЦІЦКІ.

«Слабаалкагольных напояў не павінна быць на паліцах нашых крамаў, бо гэтую вадкасць могуць купляць і ўжываць нават зусім маладыя юнакі і дзяўчаты», — лічыць намеснік міністра. Да таго ж, рэгуляванне абароту слабаалкагольных напояў не ў поўнай меры прадугледжана айчынным заканадаўствам. Міхаіл Свянціцкі выказаў занепакоенасць вялікім аб'ёмам ужывання алкагольных напояў насельніцтвам нашай краіны. Цяпер у год на душу насельніцтва прыпадае каля 12,4 літра чыстага алкаголю. Але цалкам забараняць продаж і ўжыванне алкаголю было б памылкай, лічыць прадстаўнік Мінгандлю. Міхаіл Свянціцкі таксама паведаміў журналістам, што спецыялістамі міністэрства цяпер падрыхтаваны пералік тавараў для льготнага спажывецкага крэдытавання. Сюды ўвайшлі бытавая тэхніка, мэбля, асобныя будматэрыялы і іншая прадукцыя выключна айчыннай вытворчасці.

Указ кіраўніка дзяржавы па льготным спажывецкім крэдытаванні пачынае дзейнічаць з 8 жніўня. Яго змогуць атрымаць малазабяспечаныя грамадзяне, у якіх сярэднямесячны даход на кожнага члена сям'і не больш як 1,13 млн рублёў. Ільготны спажывецкі крэдыт будзе выдавацца тэрмінам да 3 гадоў пад 10 працэнтаў гадавых.

«Дрэннымі» слабаалкагольнымі напоямі, паводле меркавання спецыялістаў Мінгандлю, лічацца газаваныя напоі, якія ўтрымліваюць 6—7 градусаў алкаголю, такія як «ром-кола», «джын-тонік», «гарэлка-кола» і іншыя.

Сяргей КУРКАЧ.

НЕ ВЫТРЫМАЛА СПАКУСЫ?

Краснапольскі РАУС распачаў крымінальную справу супраць сацыяльнага работніка, якая падазраецца ў крадзяжы 400 тысяч рублёў у пенсіянера. Паштальён прынесла пенсію 82-гадоваму мужчыну, і ён схаваў свае грошы ў кнігу. Тайнік убачыла 47-гадовая жанчына, якая даглядала старога. Ён яшчэ ці то сур'ёзна, ці то жартам папярэдзіў: маўляў, не чапай мае грошы, інакш заяўлю ў міліцыю. Тым не меней, купюры зніклі, а цяпер ідзе следства, якое падазрае ў крадзяжы сацыяльнага работніка.

Алена КАЗЛОВА.

БУДАЎНІЦТВА ПЛАДАСХОВІШЧАЎ ІДЗЕ МАРУДНА

Ва Урадзе

Згодна з праграмай забеспячэння краіны айчыннай агародніной з улікам стварэння неабходных умоў яе захавання, у эксплуатацыю з 2006 па 2008 гады былі ўведзены сховішчы ў 58 арганізацыях агульнай ёмістасцю 112,3 тысячы тон, ці 101 працэнт ад задання. Пра гэта на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, паведаміў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён ШАПІРА. Ён таксама праінфармаваў, што на гэты год былі перанесены тэрміны ўводу яшчэ двух аб'ектаў — сховішчаў для агародніны ў ААТ «Прамагралізінг» і РУП «Інстытут агародніцтва».

А вось па будаўніцтве і рэканструкцыі пладасховішчаў, якое, на думку Сямёна Шапіры, ідзе марудна, прэтэнзіі міністра былі адрасаваны, у прыватнасці, аблвыканкамам. За чатыры гады, што рэалізуецца гэтая праграма, было ўведзена ў эксплуатацыю ўсяго 18 працэнтаў пладасховішчаў, прадугледжаных дакументам, агульнай ёмістасцю 10,1 тысячы тон. Разам з тым, да 2010 года апошні паказчык трэба давесці да больш як 27 тысяч тон. «Хачу адзначыць, што пытанне будаўніцтва і рэканструкцыі пладасховішчаў аблвыканкамамі пастаянна не кантралюецца», — заявіў міністр. І зазначыў, што толькі выканаўшы заданні па іх будаўніцтве, а таксама па будаўніцтве сховішчаў для гародніны, рэспубліка можа вырашыць задачу па забеспячэнні насельніцтва якаснай плодаагароднінай прадукцыяй у міжсезонны перыяд.

Між тым, **паводле слоў міністра гандлю Валянціна ЧАКАНАВА,** сёлета аб'ёмы закладкі харчовых рэсурсаў у стабілізацыйныя фонды будуць не ніжэйшыя за леташнія. Праўда, пакуль не з усімі абласцямі ўдалося дамовіцца па аб'ёмах закладкі асобнай прадукцыі раслінаводства. Аднак гэтае пытанне, падкрэсліў міністр, неабходна вырашаць як мага хутчэй. Тым больш што, упэўнены ён, абласцям па сілах выканаць усё з прапанаванага.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Выпрабавана на сабе

ЯК МЫ «ВЫЦЯГВАЛІ» З БАЛОТА «ЛЯТАЮЧЫ ТАНК»

Рэпарцёр «Звязды» разам з беларускімі і расійскімі шукальнікамі даставаў з балота ў беларускай глыбінцы «лятаючы танк» — савецкі штурмавік «ІЛ-2». Ёсць меркаванне, што самалёт гэты быў падбіты больш за 65 гадоў таму ў нябёсах на тэрыторыі цяперашняга Дубровенскага раёна. Пошукавыя работы вяліся паміж вёскамі Вежкі і Пуцяціна. Мяркуецца, што быў збіты легендарны штурмавік «ІЛ», які яшчэ называюць «лятаючы танк». Шукальнікам расказалі пра самалёт тутэйшыя вяскоўцы — яны бачылі хвост крылатай машыны.

Аўтар гэтых радкоў, дарэчы, і сам нечакана знайшоў некалькі прадметаў «рэха вайны». Спаў разам з шукальнікамі ў кузаве грузавой машыны, карміў камароў, дапамагаў, як мог, кухарыць. Упершыню ў жыцці мыў рукі... гарэлкай. А колькі распазнаў цікавага! Энтузіясты, якія ўжо маюць вялікую практыку ў пошукавай рабоце, развеялі некаторыя міфы пра шукальнікаў.

Там у белых штанах не ходзяць

А паўдзельнічаў я ў па-свойму ўнікальнай акцыі, як часта бывае ў журналістыцы, выпадкова. Пра тое, што самалёт дастаюць, ужо напісаў і маленькі артыкул надрукавалі ў «Звяздзе». У пятніцу раніцай хаджу па Віцебску ў белых штанах і майцы — спякотна. «Базар» скончыўся. Самы час купіць піва і... І тут на мабільны нехта патэлефанаваў. Высветлілася, што на сувязі **дэпутат з Расіі Сяргей Уладзіміравіч ХАРЛАНЦЬЕЎ** (народны выбраннік аднаго з раёнаў Ленінградскай вобласці) — наш зямляк, родам са Шклоўскага раёна. Ён — ініцыятар правядзення пошукавых работ і актыўны іх удзельнік.

Малады дэпутат, яму трохі за 40, арганізатар падняцця затанулых танкаў часоў вайны на тэрыторыі былога СССР, адзін са стваральнікаў прыватнага некамерцыйнага музея ў Шлісэльбургу Ленінградскай вобласці, прысвечанага ваеннаму часу. Прапанаваў мне аператыўна, калі ёсць, вядома ж, жаданне, сабрацца і паехаць разам. І, магчыма, не на адзін дзень. Затое гарантаваны эксклюзіўны рэпартаж.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГЕНСЕК НАТА: ГРУЗІЯ І УКРАІНА НЕ ГАТОВЫЯ ДА ЎСТУПЛЕННЯ Ў АЛЬЯНС

Генеральны сакратар НАТА Яап дэ Хоап Схефер, які пакідае 1 жніўня сваю пасаду, прызнаў, што Грузія і Украіна на гэты момант не гатовыя да ўступлення ў альянс. Пра гэта генсек НАТА заявіў 21 ліпеня ў Вялікабрытаніі, куды прыбыў «з развітальным візітам». «Адно жаданне не дае аўтаматычнага права на ўступленне», — заўважыў Схефер. Паводле яго меркавання, еўраатлантычным планам названых краін перашкаджае іх ўнутрыпалітычнае становішча.

Схефер падкрэсліў, што дзяржавы, якія маюць намер уступіць у альянс, павінны адпавядаць усім патрабаванням НАТА, а «сёння ні Украіна, ні Грузія не гатовыя да гэтага».

Каментарый Схефера рушыў услед за медыйным скандалам, звязаным з інтэрв'ю прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі The Wall Street Journal. У ім грузінскі лідар прызнаў, што еўраатлантычныя імкненні Тбілісі фактычна «пахаваныя». Пасля, аднак, Саакашвілі заявіў, што выданне папрасіла ў яго прабачэння за скажоны сэнс яго выказванняў.

Як вядома, Грузія і Украіна ў апошнія гады неаднаразова заяўлялі аб імкненні ўступіць у НАТА, аднак у Брусэлі да гэтых планаў ставяцца вельмі асцярожна, паколькі ва Украіне надзвычай моцныя антызаходнія настроі, а еўраатлантычныя далягляды Грузіі сталі вельмі імглістымі пасля вайны ў Паўднёвай Асеціі ў жніўні 2008 года. Гэты канфлікт да краю абвастрыў адносіны паміж Масквой і Тбілісі, і, як вынік, паміж Масквой і Брусэлем. У наступным НАТА аднавіла кантакты з Расіяй, што негатыўна адбілася на інтэграцыі Грузіі ў альянс.

КАЛЯ ПАЛОВЫ ЎКРАІНЦАЎ НЕ ВЕРАЦЬ У ЗМЕНЫ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА

Каля паловы апытаных украінцаў лічаць, што ва Украіне не будзе ніякіх зменаў пасля прэзідэнцкіх выбараў, сведчаць вынікі даследавання «5 фактаў аб украінцах», прэзентаванага ў агенцтве «Інтэрфакс»-Украіна» ў аўторак.

Даследаванне праводзілася з 5 па 15 ліпеня ў гарадах з насельніцтвам 50 тыс. чалавек і больш. У яго рамках было апытана 1500 рэспандэнтаў ва ўзросце ад 20 да 60 гадоў. Генеральны дырэктар кампаніі ІФАК Украіна Сяргей Гаваруха паведаміў, што 48 % апытаных упэўненыя ў тым, што ва Украіне нічога не зменіцца пасля прэзідэнцкіх выбараў, а 8 % лічаць, што сітуацыя пагоршыцца. Пры гэтым 27 % рэспандэнтаў звязваюць магчымыя паляпшэнні сітуацыі пасля выбараў з лідарам Партыі рэгіёнаў Віктарам Януковічам, 21 % — з экс-спікерам парламента, лідарам руху «Фронт змен» Арсенем Яцэнюком, 12 % — з прэм'ер-міністрам Юліяй Цімашэнкай і 3 % — з прэзідэнтам Віктарам Юшчанкам.

АЎТАРЫ «ІНДЭКСА БІГ МАКУ»: САМЫЯ ПЕРААЦЭНЕНЫЯ ВАЛЮТЫ — У НАРВЕГІІ І ШВЕЙЦАРЫІ

Расійскі рубель недаацэнены на 43 %, лічаць аўтары «індэкса Біг Мака», які распрацаваны часопісам The Economist. Гэта вынікае з таго, што ў Расіі папулярны ва ўсім свеце гамбургер каштуе 2,04 долара, а ў ЗША — 3,57 долара.

Яшчэ больш недаацэненыя нацыянальныя валюты Украіны і Кітая. У гэтых краінах «Біг Мак» каштуе на 49 % танней, чым у ЗША. У Кітаі і ва Украіне ахвотныя могуць купіць папулярны бутэрброд усяго за 1,83 долара. Самыя пераацэненыя валюты — у Нарвегіі і Швейцарыі. Там «Біг Мак» на 72 і 68 працэнтаў даражэйшы, чым у ЗША, або 6,15 і 5,98 долара за штуку адпаведна.

«Індэкс Біг Мака» заснаваны на парытэце пакупной здольнасці, па якім валютны курс ураўноўвае кошт гамбургера ў розных краінах.

СЛУХАЙЦЕ АГЛЯДЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»:

Радыё РМ 92,4 FM — на Радыё-Мінск з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме «КАВА ПА-ВЕНСКУ» (Мінск – 92.4 FM, Віцебск – 106.4 FM, Магілёў – 98.1 FM, Гомель – 105.6 FM)

Радыё РОКС — на Радыё-Рокс з аўторка па пятніцу РАНІЦАЙ У 7.40, УВЕЧАРЫ Ў 22.30 (Мінск – 102.1 FM, Віцебск – 103.0 FM, Гродна – 106.9 FM, Брэст – 101.2 FM, Гомель – 102.6 FM, Магілёў – 103.4 FM)

Беларускае радыё. Канал культура — на Радыё-Культура з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме «У РЫТМЕ ДНЯ» (Мінск – 102.9 FM, Віцебск – 99.3 FM, Гродна – 95.0 FM, Брэст – 88.5 FM, Магілёў – 99.1 FM, Гомель – 91.53 FM)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 822,00
▼ 1 еўра	4 007,52
1 латвійскі лат	5 724,72
1 літоўскі літ	1 160,41
1 чэшская крона	155,32
1 польскі злоты	938,43
▲ 1 расійскі рубель	90,51
1 украінская грыўня	368,41

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,1791
10 UAH	40,7038
1000 BYR	11,0173
EUR	44,2743

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Сітуацыя

Логіка рынку альбо асабістага інтарэсу?

У беларускіх аўтаперавозчыкаў расцэнкі ніжэйшыя, а перавагу, здараецца, аддаюць... іх замежным калегам

Беларуская асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (БАМАП) падтрымлівае праект NELTI па адраджэнні Вялікага шаўковага шляху і аказвае садзейнічанне яго паспяховай рэалізацыі. Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі ў Гродне падчас рэгіянальнага этапа 5-га конкурсу прафесійнага майстэрства вадзіцеляў магістральных аўтацягнікоў.

У рамках гэтага праекта, які ажыццяўляецца Міжнародным саюзам аўтамабільнага транспарту, працуюць 45 транспартных сродкаў дванаццаці кампаній з дзевяці дзяржаў Еўропы і Азіі, у тым ліку і Беларусі. Наменклатура грузаў вельмі шырокая — ад харчовых тавараў да медыкаментаў, рознага абсталявання, дыпламатычных і ваенных грузаў, бытавой тэхнікі і электронікі.

Удзел беларускіх вадзіцеляў-міжнароднікаў у гэтым праекце сведчыць аб іх высокім прафесійным майстэрстве і аўтарытэце не толькі ў нашай краіне, але і на міжнародным узроўні. Красамоўная лічба: летась ажно 194 «дальнабойшчыкі» з Беларусі былі адзначаны ганаровымі дыпломамі Міжнароднага саюза аўтамабільнага транспарту. І тым больш дзіўна, калі айчынныя прадпрыемствы аддаюць перавагу не нашым перавозчыкам, а... іх замежным калегам.

Мо, у беларускіх міжнародных аўтаперавозчыкаў надта вялікі «апетыт» па расцэнках? Але ў такім разе як зразумець факты, якія былі прыведзены на прэс-канферэнцыі кіраўнікамі некаторых транспартных кампаній гродзенскага рэгіёна? Аднаму з іх прапанавалі заведама нерэальную цану, ніжэйшую нават за сабекошт дастаўкі грузу. Зразумела, што наш перавозчык быў вымушаны адмовіцца ад гэтай здзелкі. А неўзабаве ён даведваецца, што гэты ж заказ атрымала замежная кампанія, прычым па... утрая большых грашовых стаўках. І, да таго ж, гэта не беларускія рублі, за якія могуць перавозіць грузы айчынныя «дальнабойшчыкі», а валюта.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Другога айчыннага аўтаперавозчыка папрасілі пацвердзіць факсам, што «не паедзе за такія грошы», і ў той жа дзень загружаецца транспарт літоўскай фірмы...

Верагодна, што ў такіх сітуацыях маюць месца не эканамічныя меркаванні, не логіка рынку, а асабістыя інтарэсы пэўных асобаў, што ў многіх краінах свету ўжо даўно не дапускаецца дзякуючы транспартна-лагістычным цэнтрам. Прадпрыемства, вырабіўшы прадукцыю, па сутнасці не распараджаецца яе дастаўкай пакупніку, а аддае гэту функцыю спецыялістам па транспартнай лагістыцы, якія выбіраюць найбольш рацыянальныя і для вытворцы, і для перавозчыка, і для спажыўца варыянты транспарціроўкі грузу. Праекты стварэння такіх цэнтраў на Гродзеншчыне ёсць, аднак, на жаль, спазняемся з іх рэалізацыяй, адстаём ад многіх іншых краін, чым пакуль і карыстаюцца на зусім не рыначных прынцыпах некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў і замежныя перавозчыкі.

Такой жа лагістыкі вельмі не хапае і ў выкарыстанні ведамаснага транспарту, мець які лічаць за норму многія нашы прадпрыемствы і арганізацыі. Так, свая кашуля да цела бліжэй. Аднак чаму ж у краінах Захаду ні на адным прадпрыемстве няма ўласных транспартных цэхаў? А таму, што спецыялізаваныя транспартныя фірмы ў параўнанні з ведамаснымі працуюць, як правіла, значна больш эфектыўна.

На прэс-канферэнцыі прыводзіўся такі прыклад. Штодзённа з аднаго рэгіёна Беларусі ў іншы накіроўваецца каля дзесяці аўтамабіляў, якія належаць аднаму з прадпрыемстваў, з яго таварам. Хоць спецыялізаваная транспартная кампанія забяспечыла б перавозку гэтага ж аб'ёму прадукцыі са значна меншымі затратамі. А гэтыя затраты, зразумела, укладваюцца ў цану тавару.

Дарэчы, замежны інвестар, прыйшоўшы нядаўна на адно з прадпрыемстваў Гродзеншчыны, дзе меўся даволі буйны транспартны парк, выдзеліў яго ў самастойнае падраздзяленне. Тым самым даўшы зразумець, што эфектыўнасць працы перавозчыкаў не павінна «хавацца» за агульнымі вытворчымі паказчыкамі.

Яшчэ адна вельмі сур'ёзная праблема, паводле інфармацыі **старшыні асацыяцыі «БАМАП» Мікалая БАРАВОГА,** звязана з абнаўленнем парку рухомага саставу. Летась, калі развіццё міжнародных аўтамабільных перавозак дасягнула ў рэспубліцы максімуму практычна па ўсіх паказчыках, узровень абнаўлення як айчыннымі, так і імпартнымі транспартнымі сродкамі дасягнуў ажно 14 працэнтаў. Утрая больш да ўзроўню 2006 года! Набыта 1302 новых седлавых цягачоў і грузавых аўтамабіляў, а таксама 1198 паўпрычэпаў і прычэпаў. Здавалася б, радавацца трэба, але...

«Грымнуў» сусветны фінансава-эканамічны крызіс, значна скараціліся аб'ёмы экспартных паслуг і ўвогуле перавозак. А дамовы на набыццё транспарту з банкамі і лізінгавымі кампаніямі былі разлічаны на зусім іншыя, значна большыя даходы ад яго працы. У выніку — праблема з лізінгавымі плацяжамі, што пагражае перавозчыкам стратай транспартных сродкаў, а значыць, пройгрышам калегам-канкурэнтам у паслякрызісных умовах. Адна надзея, што банкі і лізінгавыя кампаніі з разуменнем паставяцца да сітуацыі, што склалася на рынку міжнародных перавозак, і згодзяцца на іншыя тэрміны разліку...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БУДАЎНІЦТВА ПЛАДАСХОВІШЧАЎ ІДЗЕ МАРУДНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Валянцін Чаканаў таксама паведаміў, што за пяць месяцаў гэтага года ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам удалося скараціць аб'ём імпарту ў краіну бульбы на 65 працэнтаў, морквы і буракоў — на 82, цыбулі-рэпкі — на 18, капусты — на 52 працэнты.

Разам з тым, **прэм'ер-міністра Сяргея СІДОРСКАГА** не задавальняюць не толькі пытанні, якія датычацца ўводу новых плодаагароднінных сховішчаў, але і цяперашні стан аб'ектаў, што будаваліся ў 60—70-х гадах. Кіраўнік Урада, у прыватнасці, адзначыў, што стан матэрыяльна-тэхнічнай базы сховішчаў таго ж Белкаапсаюза не дазваляе забяспечваць неабходны рэжым захавання плодаагароднінной прадукцыі. «Са 180 сховішчаў спажыўкааперацыі 58 працэнтаў наогул не забяспечаны сістэмай актыўнай вентыляцыі для падтрымання неабходнага рэжыму захоўвання прадукцыі», — падкрэсліў ён. Здзіўленне прэм'ера выклікае і тое, чаму нельга гэтыя памяшканні прывесці ў належны стан, што гэтаму перашкаджае. Звяртаючыся да **Уладзіміра КУЛЯШОВА, старшыні Белкаапсаюза,** прэм'ер запатрабаваў ад яго больш эфектыўнай працы. «Я ў краме браў італьянскія памідоры і з улікам захоўвання і транспартных расходаў яны цалкам канкурэнтаздольныя з беларускай прадукцыяй», — заўважыў ён.

У сваю чаргу Уладзімір Куляшоў паведаміў пра тое, што за тры апошнія гады Белкаапсаюзам было ўкладзена ў мадэрнізацыю і рамонт сховішчаў 8,3 мільярда ўласных сродкаў. Ён таксама падкрэсліў, што тых сховішчаў, што ёсць у сістэме спажыўкааперацыі, цяпер дастаткова для захоўвання неабходнага аб'ёму плодаагароднінной прадукцыі. Паводле яго слоў, Белкаапсаюз звяртаўся з просьбай ва Урад аб выдзяленні 14 мільярдаў рублёў, якія планаваў выкарыстаць на аснашчэнне немадэрнізаваных сховішчаў вентыляцыйнымі і тэмпературнымі рэжымамі. Крэдытныя рэсурсы на гэтыя мэты, на думку Уладзіміра Куляшова, выкарыстоўваць нявыгадна. Ён патлумачыў, што цяпер розніца ў цэнах паміж закладкай прадукцыі і рэалізацыяй змяншаецца, яна блізкая да нуля. «Раней мы бралі за кошт таго, што восенню закладвалі прадукцыю па адных цэнах, а зімой і бліжэй да вясны цэны былі зусім іншыя, — дадаў кіраўнік Белкаапсаюза. — За кошт гэтай дэльты мы атрымлівалі неблагія даходы і пакрывалі расходы на ўтрыманне сховішчаў».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

МОКРАЕ ЖНІВО

Гэты год для ўборкі збожжавых не з лепшых, а нехта кажа, што такога цяжкага жніва даўно не было. Дажджы перадышкі не даюць — лье амаль штодня. Здараецца, што навальніца з градам праходзіць паласой, і некаторым гаспадаркам наносіць вялізныя страты. Усё ж жніво пачалося і з кожным днём яно набірае абароты.

А што паказваюць першыя намалоты? Яшчэ невядома, як яно пойдзе далей, але ўсё паказвае на тое, што дажджы паспрыялі і збожжа ўрадзіла.

У пераважнай большасці раёнаў Брэстчыны ўзялі з гектара больш збожжа, чым у мінулым годзе. Напрыклад, у Жабінкаўскім раёне намалацілі 43,3 ц/га, а ў 2008 годзе ўсяго 36,3, у Лунінецкім адпаведна 31,7 ц — 22,8 ц, Ляхавіцкім: 40,1 ц — 23,8 ц. Самыя высокія намалоты ячменю ў Жабінкаўскім раёне — амаль 51 ц/га, а азімага рапсу ў Драгічынскім — 28,2 ц/га.

Дарэчы, у мінулым годзе ўборка рапсу па вобласці на гэты час была амаль завершаная. А пакуль што гэтай культуры ўдалося ўбраць меней за 40 працэнтаў, а вось ураджайнасць больш высокая.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У ЛЕС ПА ГРОШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вясковыя сем'і заўсёды імкнуцца зарабіць у сезон. У аблспажыўсаюзе расказваюць, што звычайна дарослыя і дзеці ходзяць у лес у ягады і грыбы штодня раніцай і ўвечары: за дзень на нарыхтоўках яны разам могуць зарабіць да 100 тысяч рублёў!

Людзі прапануюць дарункі лясоў на прыдарожных базарах: там цэны вышэйшыя за кааператыўныя прыкладна на 1 тысячу рублёў, і суровыя прадаўцы звычайна не схільныя рабіць аўтамабілістам скідкі. Аднак большасць, каб не марнаваць часу на чаканне пакупнікоў, прыносіць сабраныя ягады і грыбы ў крамы, дзе на атрымваныя грошы можна адразу набыць розныя тавары.

Цяпер усе прылаўкі на дарогах і рынках спалучаюць цёмна-сіні чарнічны колер з яркім жоўтым. Лісічкі — яшчэ адзін «хіт» цяперашняга часу. Спажыўсаюз прымае **лісічкі па 3-4 тысячы за кілаграм.** У Магілёўскай вобласці нарыхтавана толькі 7 тон: гэта ўдвая менеш за леташні ўзровень, але тут усё будзе залежаць ад надвор'я.

У Еўропе ёсць попыт на лісічкі, але кан'юнктура рынку змянілася: цяпер лісічкі еўрапейцы прымаюць не замарожанымі, а свежымі. Таму адпраўляць грыбы вялікі фурамі на Захад стала больш складана.

— Але лісічку і ўсе грыбы мы будзем прымаць без абмежаванняў, — запэўніў Аляксандр Уткін. — Нам трэба забяспечыць сыравінай і свае беларускія кансервавыя заводы, якія прымаюць ад нас салёныя лісічкі. З задавальненнем прымаем таксама белыя грыбы, апенькі, грузды. Летась, асабліва ў Мінску, вялікую папулярнасць набылі салёныя глускія грузды. Замарожаныя грыбы, якія таксама карыстаюцца папулярнасцю ў гаспадынь, вырабляе наш новы цэх у Глуску.

У вясковых крамах сёння прымаюць любую гародніну і садавіну з уласных агародаў. Напрыклад, за **агуркі** цяпер плацяць **500—600 рублёў** за кілаграм. Іх ужо цяпер пачынаюць саліць у бочках, таму што леташні сезон выявіў актыўны попыт беларусаў на салёныя агуркі, і спажыўтаварыствы імкнуцца яго задаволіць і зарабіць на гэтым.

Але ўсё ж найбольш актуальныя цяпер для нарыхтоўшчыкаў — **парэчкі.** За **кілаграм чорных** цяпер даюць **1600—2200 рублёў, чырвоных — 1400—1800 рублёў.** Таксама прымаюць і **вішні**, кілаграм якіх каштуе **1200—1600 рублёў.**

Ягады важны для беларускіх заводаў для вырабу віна, джэмаў і варэння.

— Сёлета, трэба адзначыць, у нас не самы вялікі ўраджай ягад, — прызнае Аляксандр Уткін. — А вось крызіс на нарыхтоўчую кампанію вялікага ўплыву не мае. У нас, безумоўна, ёсць праблемы са сродкамі, але насельніцтва іх не адчувае, і гэта самае галоўнае. Крызіс крызісам, а есці трэба!

Ілона ІВАНОВА.

АВАРЫЙНЫ ВЫХАД БЫЎ ЗАБЛАКІРАВАНЫ

Уцэху Слуцкага мясакамбіната, дзе ў мінулую суботу адбылася ўцечка аміяку, у мэтах прадухілення крадзяжу мясной прадукцыі быў заблакіраваны аварыйны выхад. Пра гэта ў інтэрв'ю паведаміў начальнік дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віктар БАРОЎСКІ.

Нягледзячы на ўзнікненне аварыі і распаўсюджванне пароў аміяку, персанал мог бы бяспечна пакінуць памяшканне, калі б не быў заблакіраваны эвакуацыйны выхад. Адміністрацыя прадпрыемства, напэўна, пайшла на такі недапушчальны крок, каб змагацца з крадзяжамі мясных паўфабрыкатаў.

Адпаведным службам яшчэ трэба будзе разабрацца ў правільнасці абуладкавання цэха. Паводле слоў начальніка дэпартамента, на мясакамбінаце практычна адсутнічае праектная дакументацыя. «Мы звязаліся з праектным інстытутам, і нам пашанцуе, калі там знойдуць кантрольную копію», — сказаў ён.

Віктар Бароўскі дадаў, што будзе арганізавана праверка ўсіх прадпрыемстваў, на якіх выкарыстоўваецца аміяк.

Як паведамлялася, 18 ліпеня з трубаправода халадзільнай камеры выцекла каля 200 кг аміяку. Гранічная дапушчальная канцэнтрацыя гэтага рэчыва ў паветры была перавышана ў некалькі соцень разоў. У выніку аварыі загінула работніца прадпрыемства, пацярпелі яшчэ чатыры чалавекі, тры з іх знаходзяцца ў стабільна цяжкім стане, а адзін у стане сярэдняй цяжкасці. Паводле папярэдняй версіі, прычынай аварыі стала няякаснае зварное злучэнне трубаправода.

БЕЛТА.

ПА СЛЯДАХ ЛІСЫ АЛІСЫ

Махлярка выманіла ў 12-гадовай магіляўчанкі 400 тысяч рублёў.

17 ліпеня каля 18 гадзін на праспекце Пушкіна ў Магілёве дзяўчынка па дарозе ў краму сустрэла цыганку. Незнаёмая жанчына паклікала дзяўчынку. Наступныя падзеі школьніца ўзгадвае з цяжкасцю: яна гаварыць, што была нібыта пад гіпнозам. Цыганка наваражыла ёй смерць блізкага чалавека і паведаміла, што можа дапамагчы зняць сурокі. Дзяўчынка пайшла дадому, прынесла бутэльку з вадой і сямейныя грошы. Жанчына ваду вярнула, а грошы забрала і знікла. Школьніца прыйшла ў сябе толькі праз гадзіну… Кастрычніцкі РАУС распачаў крымінальную справу.

Алена КАЗЛОВА.

Абзац

◢ Споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка, крытыка і літаратуразнаўцы, акадэміка Віктара Каваленкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа. Памёр у 2001 годзе.

◢ **У Добрушскім раёне вядуцца пошукі жыхаркі райцэнтра 1945 г.н., якая пайшла ў лес у грыбы, аднак дадому не вярнулася. Яе родныя звярнуліся па дапамогу ў міліцыю. Да пошукаў падключыліся выратавальнікі, леснікі і мясцовыя жыхары. Ужо абследавана больш за 35 кв. км лясной плошчы. Пошукі працягваюцца.**

◢ Учора ў Гродне адчыніўся цэнтр дыягностыкі спадчынных пухлін. Такі цэнтр — першы ў Беларусі, ён створаны па праекце ЕС. Праект накіраваны на ранняе выяўленне анкалагічных захворванняў малочнай залозы і тоўстага кішэчніка.

◢ **У Беларусі дзейнічае каля 400 гульнявых установ. Цяпер адчынена 395 такіх установ, з іх 356 залаў гульнявых аўтаматаў і 39 казіно. Акрамя гэтага, працуюць 173 букмекерскія канторы. У кожнай вобласці дзейнічае каля 40 залаў гульнявых аўтаматаў, некалькі казіно (за выключэннем Гродна, дзе адчыненая толькі адна ўстанова з гульнявымі сталамі) і больш за 20 букмекерскіх кантор.**

◢ Вірус грыпу можа на працягу двух тыдняў жыць на грашовых купюрах, а пры спрыяльных умовах — і яшчэ даўжэй. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы ўніверсітэцкай клінікі ў Жэневе пасля адпаведных даследаванняў. Для папярэджання нават самай малой рызыкі медыкі рэкамендуюць перш за ўсё мыць рукі. На выпадак пандэміі свінога грыпу Бернскі банк закупіў пальчаткі для сваіх супрацоўнікаў, якія працуюць з наяўнымі.

Поўны абзац

◢ **Аўтапрабегам па ўкраінскім і расійскім бездарожжы вырашылі ўдарыць львоўскія ўладальнікі гарбатых «запарожцаў». Калона такіх аўтамашын накіравалася ў Санкт-Пецярбург. А падставай для гэтага быў жарт кіраўніка горада на Няве Валянціны Мацвіенка, якая, знаходзячыся на святе юбілею Львова, убачыла кавалькаду «гарбатых». Убачанае ёй спадабалася, і яна адразу ж жартам запрасіла ўладальнікаў народнага аўто 60-х у свой горад. А яны і паехалі! У Піцер львоўскія «запарожцы» едуць праз Прыбалтыку. Мяркуецца пераадолець да 4 тыс. км. У падарунак расіянам вязуць львоўскае піва і вышыванку для Валянціны Мацвіенкі.**

◢ Малайзійская мадэль Картыка Сары Дэві Шукарна прыгавораная да шасці ўдараў пальмавымі розгамі за ўжыванне піва ў бары. Суд лічыць, што гэта паслужыць папярэджаннем іншым мусульманам. Акрамя гэтага, яна прыгавораная і да штрафу ў 5 тыс. рынгіт (каля тысячы еўра). Мадэль заявіла, што абскардзіць такое рашэнне ў вярхоўным судзе, аднак судовая ўлада ў пераважна мусульманскай Малайзіі рэдка адмяняе прысуды рэлігійных судоў.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЯК МЫ «ВЫЦЯГВАЛІ» З БАЛОТА «ЛЯТАЮЧЫ ТАНК»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па дарозе, калі сядзеў у салоне ягонай прэстыжнай машыны, я ўсё пытаў: а навошта вам «капацца ў балоце?» Хобі? Мог бы недзе адпачыць на добрым замежным курорце.

— Як растлумачыць, каб ты зразумеў? Бачыў бы ты слёзы радасці і адначасова гора на твары ўдавы, якая так і не дачакалася свайго мужа з фронту, нават не ведае, дзе ён загінуў, дзе пахаваны, калі мы прыязджаем да яе і расказваем, што адшукалі месца гібелі, — расказвае Сяргей Уладзіміравіч. — Бо нават праз дзесяцігоддзі можна па медальёне, які выдаваўся вайскоўцам, вызначыць прозвішча. А калі няма жэтона, то і па іншых прыкметах. Напрыклад, прозвішча лётчыка можна вызначыць па нумары рухавіка самалёта, на якім ён лятаў. У расійскіх ваенных архівах маюцца такія звесткі.

...Даволі хутка мы прыехалі на месца нашага прызначэння. Спецыяльная тэхніка для выпампоўвання вады, грузавік з надпісам на дзверцах — ДТСААФ. Мужчыны розных узростаў у камуфляжнай форме нешта капаюць, носяць. Адным словам — займаюцца невядомай мне пошукавай работай. А тут я — які яшчэ нядаўна хадзіў у белых штанах.

Гэй, рэдактар, абірай бульбу!

Пазнаёміўся я з удзельнікамі лясной «экспедыцыі». Цікавыя вельмі людзі. Праўда, спачатку ставіліся да мяне з нейкай асцярогай.

Юрый Белавусаў, лётчык-інструктар мінскага цэнтральнага аэраклуба ДТСААФ, адразу прызнаўся, што меў не самы лепшы вопыт стасункаў з журналістамі.

— Напішуць нешта, напрыклад, пра вінт верталёта, што «ўсё марудней пры пасадцы круціцца», дык потым прафесіяналы чытаюць і смяюцца, — гаворыць Юрый. — Трэба ж думаць што пішаш, праверыць усё, параіцца з тымі, хто разумее тэму.

Паколькі я з журналісцкага брацтва, усё «падколкі», а потым і павага даставаліся ў лесе мне.

— Рэдактар, ідзі маладую бульбу абірай. Можаш? — падколвае мяне Сяргей Пятровіч Ёлкін, які пайшоў на пенсію з радоў расійскай арміі ў званні старшага прапаршчыка. Хай таксама не пакрыўдзіцца Сяргей Пятровіч, але адразу ён міжволі нагадаў мне ўсім вядомага героя серыяла прапаршчыка Шматко. Такі ж актыўны, па слова жартоўнае ў кішэню не палезе. Высветлілася, што служыў ён на Поўначы. Узнагароджаны медалём «За адзнаку ў воінскай службе ў Запалярні». Актыўна займаўся падчас службы пошукавай дзейнасцю. І цяпер вось працягвае гэтую справу. Жыве цяпер у Мінску, працуе ў аэраклубе ДТСААФ начальнікам радыёстанцыі. Пятровіч расказаў і пра свайго брата, які ў 53 гады па-ранейшаму служыць — у горадзе Котлас Архангельскай вобласці. А гэта даволі рэдкая з'ява — служыць у авіяцыі ў такім узросце. І пра юбілей сумеснага жыцця з жонкай расказаў. А яшчэ — ён тут лебедзяў карміў: «Я ж паўночны чалавек, мне так прыемна было карміць іх прама з рук. Я так шчыра пры гэтым радаваўся, напэўна, мясцовыя жыхары, якія назіралі за гэтым, і не зразумелі, чаму здаровы мужык, як дзіця, з птушкамі возіцца!». А сам Пятровіч па-добраму здзівіўся, калі я з'еў цэлую бляшанку тушонкі, якую ён мне прапанаваў з таго, што засталося ў яго пасля звальнення. «Не з'ясі ўсё — не дам, бо рэдкасць вялікая — гэтая тушонка» — падколваў мяне мой новы таварыш. Смачная тушонка!

Пазнаёміўся і з прадстаўнікамі беларускага дабрачыннага фонду дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам «Памяць Афгана». Людзі гэтыя добра вядомыя тым, што дастаюць з зямлі, балот тэхніку ваенных часоў, рэстаўруюць. А знакамітая «Лінія Сталіна», дзе цяпер шмат турыстаў — гэта і яны пастараліся, каб там з'явіўся ўнікальны ваенна-патрыятычны комплекс. І з хлопцамі — вайскоўцамі з 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сілаў Беларусі пазнаёміўся. Яны прыехалі спецыяльна сюды з пасёлка Заслонава Лепельскага раёна, бо падчас работ у балоце знайшлі чалавечыя астанкі. Фрагменты костак даставалі і частку абутку.

Дайце мне металашукальнік!

Сяргей Харланцьеў прэзентаваў мне кепку, зразумела ж, камуфляжнага колеру і даў панасіць куртку памеру такога, што быў я ў ёй, як у паліто.

Дайце і мне нешта адшукаць! — усё прасіў я. Ну, бяры, ты ж цяпер свой! — пачуў ад шукальнікаў. І ўсё пры гэтым падколвалі. Маўляў, «разумны рэдактар» сам разбярэцца, як карыстацца. А я ж і не ведаў, як правільна ўзяць металашукальнік у рукі. Пашкадавалі няшчаснага, дапамаглі. Уключылі прыбор. І пачаў я хадзіць, шукаць. Сігналы чуеш, калі нешта металічнае пад шукальнікам. Бац, сігналы. Пакапалі — куля ад кулямёта... Удача.

Самалёт, правільна сказаць, тое, што ад яго засталося, нават і не ў балоце насамрэч, а ў маленькім яры, што падтоплівае вада. Як потым мне расказалі, упершыню даводзіцца працаваць у такім месцы.

— Гліна, дарэчы, вось глядзіце, гэтая — вельмі карысная для здароўя, — расказвае **Уладзімір Арцёмавіч ХАРЛАНЦЬЕЎ са Шклоўскага раёна, пенсіянер, бацька дэпутата.** — Раны зажываюць хутка, наогул карысная рэч. Пытаеце, навошта майму сыну, нам трэба ўсё гэта? Ну, так мы яго выхавалі. І званы ў цэрквах у Шклове і ў вёсцы — яго падарунак. Такі чалавек.

Разгаварыліся. Высветлілася, што 73-гадовы Арцёмавіч, як з павагай называлі яго шукальнікі, аказваецца, яшчэ і паэт. А да выхаду на пенсію працаваў юрыстам. Прысвяціў верш і месцу, дзе загінуў лётчык. На жаль, вялікі верш, напісаны ад душы на рускай мове, не можа ўмясціцца ў артыкул. А напісана добра. Дарэчы, хочуць верш выбіць на помніку, што паставяць загінуламу. Бюст задумалі паставіць.

Міфы пра шукальніка

Пазнаёміўся я і з вопытным шукальнікам, жыхаром Петрадварца **Міхаілам ДЗЕГЦЯРОВЫМ.** Ён цяпер працуе ў камерцыйнай расійскай структуры і адзін з членаў ліцерскага пошукавага атрада — «Космас». А службу ў арміі скончыў у званні маёра.

— Пра міфы пытаеш? Ну, вось ходзяць чуткі — за медальён кожнага нямецкага афіцэра і салдата, быццам бы, Германія выплачвае вялікія грошы. Не так гэта, — расказвае Міхаіл, — праверана на практыцы. Ты ж зразумей: нявыгадна плаціць нават параўнальна багатай дзяржаве вялікую кампенсацыю сваякам загінулага немца. За столькі гадоў пасля вайны. Іншая рэч, калі пажадаюць падзякаваць сваякі.

Другі міф, маўляў, шукальнікі, у асноўным, былыя ваенныя. У нас ёсць у атрадзе людзі розных прафесій і ўзростаў. Стаць сапраўдным шукальнікам няпроста. Прыглядаемся ўважліва да навічкоў. Як старанна працуюць, ці бяруць нешта сабе са знаходак «на памяць», і не дай Божа, на продаж? Усе каштоўныя знаходкі абавязкова здаём у музеі. Часцей за ўсё акцыі па пошуку арганізоўваем вясной і восенню.

Наконт «чорных» капальнікаў, скажу: іх няшмала, і часта спрабуюць працаваць паралельна з сапраўднымі — легальнымі шукальнікамі. Дык вось, сакрэт табе адкрыю: у складзе нашых атрадаў ёсць і міліцыянеры. Не абавязкова яны ў форме. Едуць з намі ў камандзіроўкі, сталі нам таварышамі. Калі бачым побач «чорных» капальнікаў, прымаем меры. Пошукавая дзейнасць немагчымая без афіцыйнага дазволу, усе атрады зарэгістраваныя ў якасці грамадскіх арганізацый. Калі разам працуюць некалькі, ствараюцца штабы.

Ці ёсць «абрад» прыняцця ў шукальнікі? Ну, закопваюць бляшанкі кансерваў, якія трэба кандыдатам адшукаць. Ды няпроста гэта зрабіць, бо наладжваюцца імправізаваныя выбухі, успышкі, як быццам бы падчас сапраўднага бою.

Спалі мы ў кузаве машыны. Каб галоднымі засталіся камары, накрылі кузаў парашутнай тканінай. Харчаваліся «з вогнішча»: кашы, тая ж бульба свежая — смачна!

Здзівіла трохі, што многія так старанна галіліся раніцай, быццам бы не ў лесе, а ў горадзе, у сваёй ваннай перад выхадам на працу. Ужо ў суботу ў другой палове дня я замітусіўся — трэба ж ехаць дамоў, а як, на чым? Усё жартавалі таварышы з ДТСААФ: не хвалюйся, у нас сувязь з нашым начальствам ёсць, адвязём на крылатай машыне.

...Сёння я зноў у белых штанах. А яны ўсё там працуюць. Калі ад'язджаў, запланавалі падняць рухавік самалёта. А калі потым патэлефанавалі з лесу, сказалі, што знайшлі пісьмо лётчыку з ягонага дому, дзе расказваецца, як падрос ягоны сын. Знайшлі, акрамя гэтага, кніжку, па якой ваенныя атрымлівалі пайкі. І грошы тых часоў — 13 рублёў рознымі купюрамі. Даставалі і лопасць з надпісам «ОП-3». Відаць, такім чынам адзначылі гэтым знакам вопытны самалёт. Пошукаўцы, між іншым, звярнулі ўвагу на тое, як лёгка вузлы і дэталі, што знайшлі, раскручваюцца. Магчыма, зборка вялася ўручную. Якасць зборкі эксперыментальнай машыны вельмі высокая.

Шукальнікі добра папрацавалі, каб дастаць тое, што засталося ад самалёта. Значыць будзе вядома яшчэ адно прозвішча пакуль невядомага ваеннага чалавека, загінулага падчас вайны, якая ўсё далей ад нас. А шукальнікі адкрываюць нам яе таямніцы. Знойдзеныя фрагменты самалёта зоймуць дастойнае месца ў музеі. Паводле слоў Сяргея Харланцьева, плануецца зрабіць копію самалёта і выставіць у музеі авіяцыйнай тэхнікі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Дубровенскі раён.
Фота аўтара і шукальнікаў.

Чытальня

Даследчык гісторыі Мікалай Нікалаеў знайшоў новы беларускі горад

НАЛІЧВАЕ ЁН НЕ МЕНШ ЯК 100 ТЫСЯЧ НАСЕЛЬНІЦТВА, А МЕСЦІЦЦА... У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

І гэта не адзінае адкрыццё, якое доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, старшыня асацыяцыі беларусістаў Санкт-Пецярбурга зрабіў падчас работы над энцыклапедычным выданнем «Беларускі Пецярбург». Журналісты называюць кнігу ўнікальнай, а сам аўтар — першай спробай прасачыць гісторыю «ўсходняй», расійскай дыяспары беларусаў.

А пачалася гэта праца, калі паўночная сталіца Расіі рыхтавалася адзначыць у 2003 годзе свой юбілей. Да святочнай даты адна за адной пачалі друкавацца кнігі, прысвечаныя нацыянальным меншасцям у Пецярбургу — гісторыя абшчыны татараў, фінаў, палякаў, немцаў, асецінаў, нават французаў... А выхадцы з Беларусі чамусьці маўчалі, хоць дагэтуль і ладзілі рэгулярна навукова-практычныя канферэнцыі «Санкт-Пецярбург і беларуская культура», паводле матэрыялаў якіх выйшлі ў свет 17 «Беларускіх зборнікаў».

— Я сказаў сабе: калі не мы, то хто? — узгадвае Мікалай Нікалаеў. — Пачаў збіраць матэрыялы і зразумеў, што раблю геніяльнае адкрыццё. Вынайшаў горад, пра які не згадваюць падручнікі па гісторыі і геаграфіі, таму што ён за межамі беларускай этнічнай тэрыторыі. 100-тысячны беларускі горад у Санкт-Пецярбургу — большы па насельніцтве, чым былі ў той час гарады Вільня, Беласток, Смаленск, Віцебск і Мінск!

Зрэшты, лічба гэта не абсалютная. У XIX стагоддзі ў Пецярбургу пражывала ўсяго каля 20 тысяч выхадцаў з Беларусі, потым іх колькасць вырасла да 40, а там і да 100 тысяч, а ў час Першай сусветнай вайны за кошт бежанцаў дасягнула нават 1 мільёна чалавек!

— Прычым людзі гэтыя былі не толькі, як нас вучылі ў школе, «пан сахі і касы», — працягвае здзіўляць даследчык. — Я сустракаў падчас працы беларусаў — інжынераў, артыстаў оперы, навукоўцаў, лекараў вышэйшага класа, адным словам, інтэлігенцыю, і было яе надзіва многа.

Ці трэба гаварыць, што да запланаванай даты скончыць працу над кнігай і выдаць яе не ўдалося. Затое ў выніку энцыклапедыя, выдадзеная сёлета, ахапіла больш як 300-гадовы перыяд і лёсы больш як 2000 выхадцаў з беларускіх земляў, у тым ліку і нашых сучаснікаў.

Вы ведалі, напрыклад, што сярод нашых слынных землякоў — ураджэнец Віцебска, славуты оталарынголаг Аляксандр Прусак (у кожнага з нас у вуху ёсць так званая «кішэня Прусака») і стваральнік у Ваеннай медыцынскай акадэміі кафедры гінекалогіі, якая абслугоўвала ў тым ліку імператарскі дом, Эдуард-Антон Красоўскі — ураджэнец Слуцка? Або што і забойца цара Аляксандра II тэрарыст Ігнат Грынявіцкі, і медык, які спрабаваў выратаваць манаршую асобу, генерал Багдановіч — абодва родам з Магілёўшчыны? Ці што беларускі хірург і анколаг, заслужаны ўрач Расіі Міхаіл Ханевіч выратаваў калісьці акадэміка Ліхачова? А што ўжо ў наш час мінчанін Лявон Навасельскі — марак, капітан I рангу, які некалі перажыў апраменьванне падчас аварыі на падлодцы, выступіў заснавальнікам і зарэгістраваў у мэрыі Санкт-Пецярбурга Беларускае грамадска-культурнае таварыства, якое цяпер аб'ядноўвае некалькі тысяч чалавек? «У мяне нават ёсць тэорыя, і яна пачынае жыць, што менавіта беларусы — з таго самага 1 мільёна бежанцаў, які сабраліся ў горадзе ў час Першай сусветнай вайны — зрабілі Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю», — хітра ўсміхаецца ў вусы аўтар. І гэту тэорыю пакуль што ніхто не бярэцца аспрэчваць, бо пасля гартання старонак «Беларускага Пецярбурга» верыцца ў самае неверагоднае...



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тым больш, што гэта неверагоднае спадарожнічала кнізе на ўсім шляху. Узгадаць хоць бы той факт, што само выданне стала магчымым дзякуючы добраахвотным ахвяраванням піцерскімі беларусамі ўласных грошай — ад «сціплага ўнёску» ў 500 долараў да 6000, якія ўклаў цяперашні паспяховы ўладальнік заводаў, а ў мінулым просты хлопчык з Мазыра. Падтрымку — «маральную, арганізацыйную і фінансавую» — здзейсніла і Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». І ўсё адно наклад энцыклапедыі пакуль што вельмі сціплы — у лепшым выпадку 1000 асобнікаў. Ці хопіць гэтага на шырокае кола чытачоў — настаўнікаў і вучняў, гісторыкаў і культуролагаў, бібліятэкараў і музейных работнікаў, проста ўсіх цікаўных і дапытлівых

Трэба выратоўваць унікальную шатровую царкву

Дарэчы, асвяціў гэты храм сам патрыярх Ціхан (1865—1925)

Карэспандэнт вывучаў сітуацыю

Пасля публікацыі ў «Звяздзе» пра турыстычны маршрут па Полацкім раёне ў віцебскі карпункт пачалі тэлефанаваць чытачы. Нагадаю, артыкул называўся «Да Дуброўскага і Рымскага-Корсакава ...» Дарэчы, адна жыхарка Полацка прызналася, што нават і не ведала пра такія цікавыя будынкі, аб якіх расказвалася ў артыкуле.

Госць з Санкт-Пецярбурга Пётр Бальшакоў, які прыехаў з сям'ёй да беларускіх сваякоў на адпачынак, папрасіў каардынаты турыстычнай фірмы, каб паехаць на дзянёк па месцах, дзе ёсць што паглядзець. «Звязду» выпісвае ягоны брат.

Многіх зацікавіла інфармацыя пра ўнікальны праваслаўны храм, пабудаваны ў 1908—1910 гадах, які ў свой час хацелі вывезці амерыканцы. Ужо тое, што будаўніцтва гэтай сямейнай царквы фінансаваў сваяк знакамітага кампазітара Рымскага-Корсакава, цікава. Болей за тое — вялікую цікавасць яна выклікае яшчэ і таму, што асвяціў яе, як мне расказаў **краязнаўца Віктар КАРАСЁЎ**, патрыярх Ціхан. А калісьці ён быў архіепіскапам у Дзісне. І царква ў Мышчыне знаходзілася на тэрыторыі епархіі, дзе ён служыў...

Насамрэч царква ўключана ў турыстычны маршрут. Як расказаў краязнаўца, яна перададзена епархіі і ахоўваецца дзяржавай. Але ў якім яна стане?

— Трэба як мага хутчэй выратаваць Свята-Іверскі храм, што ў вёсцы Мышчына Полацкага раёна, ад далейшага разбурэння. Мы — тутэйшыя, якім не ўсё роўна, што будзе з храмам, шукаем аховранавальнікаў. Адзін дзелавы чалавек ужо зацікавіўся, паабяцаў дапамагчы грашыма, — распавядае краязнаўца Віктар Карасёў. Краязнаўца сам паставіў шмат помнікаў вядомым землякам і ў гонар розных знакавых для раёна падзей таксама. — Добра, што вы ў «Звяздзе» ўзнімаеце гэтую тэму. Так, прыедуць турысты, падзівяцца, сфатаграфуюцца. Але... Ці шчырым і насамрэч прыемным будзе ўражанне ад таго, якой царкву ўбачаць?

Пасля рэстаўрацыі храм можа стаць насамрэч жамчужынай архітэктурнай спадчыны не толькі нашага рэгіёна, але і ўсёй Беларусі. Адразу бачна: па сваёй архітэктуры царква ўнікальная **(на фота)** — так званага шатровага тыпу. Уваход вянчае масіўны арачны ганак на фігурных калонах. Ёсць падвал. Пабудавана царква з бутавага каменю і цэглы. Вышынёй храм разам з крыжам не менш за 25 метраў... А ўявіце сабе, якім прыгожым быў іканастас з белай керамікі. Старажылы добра памятаюць, якім ён быў.

Краязнаўца расказаў мне, што царкву спрабавалі адрэстаўраваць яшчэ ў гады «перабудовы».

Тады святар **айцец ПЁТР** з благаслаўлення ўладыкі Полацка-Глыбоцкай епархіі пачаў патроху адраджаць храм. Менавіта тады, паводле ягоных слоў, амерыканцы і выказалі жаданне фінансаваць разборку царквы і перавоз яе за акіян.

— Потым царква была перададзена Шпакоўшчынскаму праваслаўнаму прыходу, — працягвае Віктар Карасёў. — Не хапала грошай на рамонт і аднаўленне, ды і цяпер іх няма. Пасля таго, як святар з прыхода памёр, царква наогул гадоў шэсць была зачыненая. І толькі ў мінулым годзе з благаслаўлення ўладыкі Полацкага і Глыбоцкага Феадосія мы разам са старшынёй сельскага Савета зрэзалі замок і ўвайшлі ў храм. Унутры вільготна падчас атмасферных ападкаў, бо дах храма працякае. А вось, бачыце, на даху бярозкі і пустазелле растуць. Добра, што хоць невялічкі касметычны рамонт у храме зрабілі. У храме рэдка праводзяць службы. Неабходна як мага хутчэй капітальна пачаць рамантаваць царкву. Бо маруднасць абыдзецца даражэй...



На фота — тая самая царква.

Неабыякавыя людзі спадзяюцца на асабістую падтрымку ў аднаўленні рэдкага па сваёй архітэктурнай форме храма з боку **старшыні аблвыканкама Аляксандра КОСІНЦА**. Пры ім актыўна аднаўляюцца храмы. Вось нядаўна храм-прыгажун адчыніў у абласным цэнтры насупраць віцебскай ратушы. Шмат увагі надаецца і развіццю ўязнога турызму.

Я звязаўся з прэс-сакратаром Віцебскага аблвыканкама і расказаў пра храм, пра тое, што людзі, дарэчы, не толькі вернікі, просяць увагі да праблемы. Ён падзякаваў за інфармацыю і абяцаў абавязкова давесці да ведама адказных асобаў аб наяўнасці праблемы. Спадзяёмся на тое, што ўрэшце, доўга не зацягваючы, пачнецца сапраўднае адраджэнне храма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Полацкі раён.

Каталікі супраць Мадонны?

Скандал

Адзін з найлепшых спосабаў прыцягнуць да сябе ўвагу — арганізаваць скандал, і чым гучнейшы, тым лепш. Асабліва безадмоўна гэты метад спрацоўвае ў шоу-бізнэсе. Найлепшае пацвярджэнне гэтаму — чарговыя выбрыкі знакамітай поп-зоркі Мадонны.

На 15 жніўня запланаваны яе канцэрт у Польшчы, дакладней, у Варшаўскім мікрараёне Бемова. Сапраўдная бура ўзнялася вакол даты канцэрта. Чаму? Прычына ў тым, што якраз у гэты дзень адзначаецца адно з найбольш ушанаваных у каталікаў святаў — Узнясенне Святой Дзевы Марыі. Мадонна ж вядомая сваімі антыкаталіцкімі правакацыямі, таму частка польскага грамадства, якое лічыцца бадай што «самым каталіцкім» у Еўропе, востра выступае за перанос даты канцэрта.

«Каталіцкія групы пратэстуюць супраць канцэрта Мадонны ў Польшчы», данасіць інтэрнэт-партал NewKerala.net у Індыі. Аналагічна інфармуе сэрвіс North Korea Times, а амерыканскі партал Upi.com грыміць: «Узрушальная навіна! Польскія каталікі блакуюць канцэрт Мадонны».

На думку Эрыка Містэвіча, эксперта па пытаннях публічнага іміджу, дата канцэрта не была выбраная выпадкова. З пункту погляду піяру дзень 15 жніўня, які вельмі важны для польскіх каталікаў, выбраны для таго, каб выклікаць гвалт вакол Мадонны і яе канцэрта.

На думку іншых спецыялістаў ад піяру, людзі, якія даюць парады Мадонне, — гэта найлепшыя на сёння спецыялісты так званага «шаптанага маркетынгу», стварэння скандальных сітуацый, пра якія будуць гаварыць і пісаць.

Як адзначае польская газета «Жэчпаспаліта», рэакцыя большасці замежных СМІ нядобрасумленная, бо яны ўнушаюць, што польскія каталікі выступаюць супраць самога канцэрта. Насамрэч размова ідзе толькі аб змене тэрміну выступлення.

— У гэты дзень, падчас вялікага свята веры, не павінна даходзіць да такога тыпу канфрантацый, — лічыць былы прэзідэнт Польшчы Лех Валенса, які падтрымаў пратэст і заклікаў арганізатараў канцэрта змяніць яго тэрмін.

— Калі супадзенне свята і варшаўскага канцэрта Мадонны запланаванае, гэта быў бы цынічны спосаб адцягнуць увагу каталікаў ад свята Узнясення,— сказаў у інтэрв'ю радыё «ЗЭТ» мітрапаліт Варшаўскі архіепіскап Казімеж Ныч.

Пратэстанты выслалі да прэзідэнта Леха Качыньскага і прэзідэнта Варшавы Ганны Гранкевіч-Вальтц зварот з просьбай перанесці дзень выступлення на больш позні тэрмін.

Як ужо адзначалася, антыкаталіцкія правакацыі — гэта сталы элемент, які Мадонна выкарыстоўвае для прыцягвання да сабе яшчэ большай увагі і росту колькасці сваіх прыхільнікаў. Розгалас рынёс ёй, у прыватнасці, кліп да песні «Like a prayer» («Любіць малітву»), у якім паказана імітацыя сэксуальнай сцэны з фігурай святога. У кліпе фігура ажыла, цалуючы Мадонну, а ў той жа момант на яе далоні з'явіліся стыгматы.

У 2006 годзе Мадонна пачала адзін з канцэртаў «Confessions Tour» («Канфесійны тур») падвешанай у позе распяцця да вялізнага крыштальнага крыжа, з церневай каронай на галаве.Тады гэта выклікала вялікае абурэнне не толькі сярод католікаў. У 2006 годзе расійскае праваслаўнае духавенства паставіла Мадонну на чале спісу ворагаў хрысціянства. У 2008 годзе супраць Мадонны пратэставаў каталіцкі асяродак у Чылі.

Аднак ніводнаму са скандальных выпадкаў з канцэртамі поп-зоркі СМІ не прысвяцілі столькі ўвагі, як на гэты раз. Прычым акцыя пратэсту толькі набірае моц. Праўда, калі б не ўзнятая бура ў СМІ, пратэст не атрымаў бы такога рэзанансу ў сусветным маштабе і падзяліў бы лёс замоўчаных і ўжо забытых пратэстаў супраць дэманстрацыі кінафільмаў «Скандаліст Лары Флінт», «Догма» ці «Ксёндз».

У Польшчы вядомасць пратэстам забяспечыў, у прыватнасці, цыкл публікацый у «Газеце выборчай», якая пісала: «Мадонна занадта перверсіўная для католікаў». З гэтага часу газеты рэгулярна інфармуюць аб дзеяннях арганізатараў акцыі пратэсту.

Дарэчы, гэта нельга тлумачыць як своеасабліваю рэкламу для Мадонны, у якой яна на гэты раз не мае патрэбы, бо ўсе білеты на канцэрт ужо раскупленыя.

Спецыялісты па іміджы лічаць, што інфармацыйны шум вакол канцэрта Мадонны з'яўляецца «кумуляцыйным эфектам» дзвюх розных, на першы погляд, падзей. Сутыкаюцца як бы дзве камунікацыйныя стратэгіі. З аднаго боку, гэта акцыі спецыялістаў ад піяру Мадонны, якія прасоўваюць канцэрт праз скандал. З іншага боку, праглядваецца дачыненне да асяродкаў, якія непрыязна ставяцца да правых сілаў і каталіцызму і маюць аказію для атакі ці спробы пасмяцца на міжнароднай арэне над «польскай цемнатой», кажа эксперт Містэвіч. На яго думку, акцыя пратэсту каталіцкіх арганізацый з'яўляецца спантаннай, яны дзейнічаюць шчыра, у згодзе з тым, у што вераць. Яны па-сапраўднаму ўключыліся ў акцыю, таму вельмі падатныя на эмоцыі. Аднак не маюць шанцаў на перамогу ў сутыкненні з людзьмі, якія маюць прафесійную практыку ў тэхніцы маніпулявання публікай.

Журналісты «Жэчпаспалітай» спрабавалі высветліць, як каментуюць пратэсты арганізатары канцэрта Мадонны ў Польшчы. Нягледзячы на тое, што фірма «Live Nation», якая рыхтуе шоу, з'яўляецца міжнародным прадпрыемствам са штаб-кватэрай у ЗША і мае разгалінаваную структуру ў друку, піяры, маркетынгу, у польскім аддзяленні фірмы журналісты пачулі:

— Няма ні прэсавага сакратара, ні каго-небудзь са спецыялістаў па сувязях з грамадскасцю, ні каго-небудзь яшчэ, хто мог бы з вамі паразмаўляць. Не можам таксама даць тэлефоны.

Па словах аднаго са спецыялістаў у галіне піяру, усё, што адбываецца, з'яўляецца сістэмай дзеянняў ў разліку «на цішыню». Нешта адбываецца, фірма маўчыць, а СМІ «шалеюць». Гэта адзін з элементаў «шаптанага маркетынгу» .

Падагульняючы вышэйзгаданае, у чарговы раз прыходзіш да сумнай высновы, што ў гэтым свеце ў пагоні за вялікімі грашыма ўсе метады прымальныя.

Падрыхтаваў Міхаіл БАЦЯН.

Нататкі з нагоды

ПАМІЖ ВОЛЯЙ І ТУРМОЮ

Сёлетняя амністыя, як і заўсёды, неадназначна была ўспрынята грамадствам. Адны ўпэўненыя, што гэта прывядзе да ўсплёску злачыннасці, а другія лічаць, што чалавеку неабходна даць шанц выправіцца на волі. А якая сітуацыя са злачыннасцю ў цэлым? Тут можна для прыкладу выкарыстаць звесткі па Баранавічах за першае паўгоддзе 2009 года.

Па словах начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Брэсцкага аблвыканкама В. Мельнікава, у Баранавічах даволі высокі працэнт раскрытых злачынстваў, у тым ліку і крымінальных. У гэтым плане баранавіцкія сышчыкі выйшлі ў вобласці на другое месца і ўступаюць толькі Маскоўскаму РАУС г. Брэста.

І хоць у горадзе стала меней забойстваў, злачынстваў з цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі, фактаў гвалту... усё ж сёлета колькасць злачынстваў выросла на 24 працэнты ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. Крадзеж, разбойны напад, ашуканства становяцца ўсё больш распаўсюджанымі. Напрыклад, за 30 чэрвеня на Брэстчыне было зарэгістравана 119 злачынстваў і гэта толькі адзін з рэкордаў, бо ў сярэднім лічба хістаецца ў межах 30—50 злачынстваў у суткі.

І тым не меней злачынства злачынству розніца. З тых 119 толькі 75 крымінальныя, і гэта многа, але і тут не ўсё адназначна. Вось у лесе каля вёскі Булькава Жабінкаўскага раёна ў дзвюх дзяўчынак 9 і 10 гадоў дваццацігадовы хлопец з вёскі Ракітніца забраў 3 кілаграмы ягад і 1 тысячу рублёў. Здавалася б, злачынства і не вельмі значнае, але яно трапіла ў разрад крымінальных. Дык вось падобных злачынстваў вельмі многа.

Беспрацоўны з пасёлка Жамчужны (Баранавіцкі раён) 15 ліпеня ўкраў у жыхара вёскі Новая Мыш 100 кілаграмаў збожжа, а другі беспрацоўны выкраў прадукты... Але найбольш часта крадуць тэлефоны. «Свіснуць» мабільнік нават у знаёмага ці сябра — звычайная рэч, а пра чужых і гаворка не ідзе. Колькасць падобных крадзяжоў па Баранавічах павялічылася на 29 працэнтаў.

У пераважнай большасці на паўторныя злачынствы ідуць тыя, хто ўжо быў асуджаны і мае не знятую ці не пагашаную судзімасць. І іх колькасць расце.

Звязана гэта з некалькімі прычынамі. Чалавека выпусцілі на волю. Але часта здараецца, што ён нікому тут не патрэбен. Гэта за савецкім часам з былым зэкам насіліся, як з распісной торбай — навязвалі прадпрыемству. А там давалі працу, інтэрнат... І хоць карысць з таго работніка была не вялікая, але трымалі. Сёння ніхто так насіцца не будзе, бо свабодных месцаў з высокім заробкам няма. Ды часта, вярнуўшыся з зоны, чалавек не спяшаецца на працу.

Давялося сутыкнуцца з такім выпадкам. У райвыканкам прыйшла жанчына па дапамогу. Яна выйшла з калоніі і па фінансавую падтрымку звярнулася ў міліцыю. Там выдалі даведку і накіравалі ў райвыканкам. Жанчыне растлумачылі, што ў бюджэце раёна на такія выдаткі грошы не закладзены. Праўда, кіраўнік раёна сітуацыю растлумачыў: «Няхай ідзе на працу ў гаспадарку. Дык за 350 тысяч яна працаваць не будзе і ўвогуле, якія з такіх работнікі?»

Нядаўна прадстаўнікі праваахоўных органаў Баранавіцкага раёна і горада сабралі каля сотні парушальнікаў, якіх суд не стаў адпраўляць у калонію ці на «хімію», а даў магчымасць перавыхавацца дома.

Вось і аказалася, што далёка не ўсе хочуць уладкоўвацца на працу. А. Васільева, начальнік раённай службы занятасці, папракнула асуджаных за «хатні арышт».

— У сваіх бедах вы часта абвінавачваеце ўсіх, але не сябе. А ў многіх з вас проста няма жадання працаваць... Вас апякаюць, дапамагаюць, але вы не хочаце мяняць нешта ў сваім жыцці....

Бяда не ў недахопе працоўных месцаў, а ў тым, што пэўны працэнт людзей, і не абавязкова былых асуджаных, не хочуць працаваць. І не дзіўна, што некаторыя з іх, толькі выйшаўшы з турмы, тут жа вяртаюцца — не здольныя жыць на волі.

Адноўчы, наведаўшы Івацэвіцкую калонію, пачуў ад пракурора, што 15—20 працэнтаў асуджаных нельга ўвогуле выпускаць з турмы, бо адразу ж уступаюць у канфлікт з законам і вяртаюцца ў знаёмыя сцены.

...У пяць гадзін раніцы можна ўбачыць, што жыццё ўжо бурліць. Людзі некуды спяшаюцца, нешта пакуюць у аўтамашыны, цягнуць каляскі з пакункамі, збіраюцца на аўтобусных прыпынках — яны вырашаюць свае праблемы, спадзяюцца на сябе. Але ж колькі маладых мужчын «тусуецца» ў будні каля крамаў ці бавяць час на лаўках у скверах? Ім таксама патрэбныя грошы. А дзе ўзяць? Трэба нешта ўкрасці, збыць, выпрасіць колькі рублёў....

— Можа, у вас ёсць сто-дзвесце рублёў, во крыху не хапае, — цягне за рукаво хлопец.

— Вунь мая машына стаіць, ты яе памый і паўтары тысячы атрымаеш.

— О-о-о, ха-ха, — абурыўся папрашайка, — я што, раб табе?!

Дарэчы, у Германіі на тых, хто сядзіць з працягнутай рукой, ніхто не звяртае ўвагі, а вось калі чалавек іграе ці спявае, то даюць... Адным словам, грошы трэба не прасіць, а зарабляць.

Вялікая колькасць крадзяжоў негатыўна ўплывае на аператыўнае становішча не толькі ў Баранавічах, але і вобласці. На фоне крадзяжоў і разбойных нападаў ашуканства не такое маштабнае. Але ў горадзе яно вырасла больш чым у два з паловай разы.

Ашуканцы дзейнічаюць найчасцей праверaным спосабам — уваходзяць у давер і людзі выкладваюць махлярам свае грошы. Да жыхара Кобрына прыйшоў 28-гадовы раней асуджаны за ашуканства знаёмы і прапанаваў пасрэдніцтва ў закупцы бульбы. Атрымаў падманам 4 300 000 рублёў і сышоў.

Тут многае залежыць ад таленту махляра, яго здольнасці абкруціць выбраную ахвяру. У Баранавічах адзін прайдзісвет «пазычыў» некалькі дзясяткаў мільёнаў пад розныя пакупкі, і аказалася, што нават да судовай адказнасці яго прыцягнуць няпроста. Пацярпелыя тыя грошы самі аддавалі.

На працягу двух гадоў у Баранавічах дзейнічалі двое ашуканцаў. Завадатарам быў 36-гадовы жыхар горада, які ўжо тройчы пабываў у турме. Схема, па якой дзейнічалі ашуканцы, была праверанай і адпрацаванай, і яна найбольш распаўсюджана ў буйных мегаполісах. Найперш неабходна было знайсці чалавека, які мае кватэру, але п'е гарэлку і мае запазычанасць па камунальных паслугах. Такога ўладальніка жылля бралі ў абарот, спойвалі, угаворвалі прадаць кватэру, а ўзамен абяцалі больш таннае жыллё... Кватэра прадавалася, а грошы асядалі ў кішэнях «добразычліўцаў». Ад продажу чатырох кватэр ашуканцы мелі «навар» у 58 млн рублёў.

Трэба прызнаць, што ўсё абышлося малой крывёю, бо ў Расіі алкаголікі ці састарэлыя, якія праз такіх «рыэлтараў» прадалі свае кватэры, знікалі назаўсёды. Ашуканцы вярнулі пацярпелым грошы, але суд Баранавіцкага раёна і горада палічыў, што лепш будзе, калі прайдзісветы тры з паловай гады правядуць у турме. Асуджаныя з прыгаворам не пагадзіліся і падалі касацыйную скаргу, але Брэсцкі абласны суд пакінуў прыгавор у сіле.

Амністыя — крок гуманны. Але ці ўсе былыя асуджаныя выкарыстаюць гэты шанц — залежыць толькі ад іх.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КРЫЎДЗІЦЕЛЯ СТАРЫХ — ЗА КРАТЫ!

Мужчыну, які ўчыніў серыю забойстваў і разбояў у горадзе Баранавічы, прыгаварылі да 25 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму.

39-гадовы неаднаразова судзімы ўраджэнец горада Маларыты ў лютым-сакавіку 2002 года наўмысна забіў двух людзей, акрамя таго, на яго рахунку — адзін замах на жыццё і два разбойныя напады. Мэта ўсіх злачынстваў — завалодаць маёмасцю пацярпелых, састарэлых жыхароў Баранавічаў.

Па словах старшага памочніка пракурора Брэсцкай вобласці Вольгі ДЗМІТРУК, падсудны добраахвотна паведаміў аб учыненых злачынствах і актыўна садзейнічаў іх раскрыццю. Суд улічыў гэта пры прызначэнні пакарання.

Надзея ДРЫЛА.

НАВАЛЬНІЦА

Навальніца, ці маланка ў народнай традыцыі ўспрымаліся як пакаранне, сіла Бога ці Ілы Граманосца, які едзе па небасхіле на сваёй вогненнай калясніцы і дасылае на зямлю палымяныя стрэлы. Згодна з дахрысціянскімі ўяўленнямі нашых продкаў, громам «кіраваў» Пярун. Славяне заўсёды шанавалі гром, бо лічылі, што кожны яго ўдар знішчае чорта ці д'ябла, бо менавіта громам Бог ці прарок Ілья праследуюць нячыстую сілу на зямлі. У народзе лічылі, што нячыстая сіла, каб схавацца ад грому, хаваецца ў чалавека, камень, ваду і г.д.

● Так з'явілася правіла: у час навальніцы абавязкова закрываць ёмістасці з вадой, а пусты посуд пераварочваць.

● З-за здолнасці нячыстай сілы хавацца ў рэчы, якія акружаюць чалавека, лічылася, што ў час навальніцы нельга стаяць пад дрэвам, на скрыжаванні дарог, сядзець ці ляжаць на мяжы.

● Лічылася, што нячыстая сіла можа схавацца ў сабаку ці ката, таму ў час навальніцы гэтых жывёл не пускалі ў хату.

● Ахоўным сродкам ад грому лічылася крапіва ці алешына, таму вандроўнікі ў час навальніцы абкручвалі сябе поясам з крапівы ці алешыны.

● На Беларусі паўсюдна лічылася, што самым надзейным сродкам ад удараў грому з'яўляецца хлебная лапата, якую на час навальніцы выкідалі праз акно ў двор. Лічылася, што ў такім выпадку зямное полымя супрацьстаіць нябеснаму, і яно не кране хату.

● Акрамя гэтага, у час навальніцы на палаючае вугольле ў печы клалі асвечаную соль, траецкія і купальскія травы.

● Паўсюдна лічылі, што ў хату, на якой бусел пабудаваў гняздо, ніколі не трапіць маланка.

● У славян чалавек, якога забіла маланка, лічыўся ці найвялікшым праведнікам, ці найвялікшым грэшнікам. Таму яго хавалі ці на могілках з вялікім гонарам, ці за агароджай могілак, як вісельніка ці самазабойцу.

● Дрэва, у якое трапіла маланка, не выкарыстоўвалі для будаўніцтва. Разам з тым, трэску ад «навальнічнага» дрэва прыносілі ў хату, у хлеў, на пчальнік як надзейны абярэг.

● Зімовая навальніца, навальніца на «голы» лес прадказвала галодны год, няўрод.

● Гром, навальніца на Святым Велікодным тыдні — да ўраджайнага, спрыяльнага года.

● На працягу года неабходна было выконваць шэраг абрадаў, каб абараніць сябе і сваю хату ад навальніцы. Адным з дзён года, калі выконваліся гэтыя абрады, з'яўляецца 15 лютага — Грамніцы. У гэты дзень неабходна было ў храме асвяціць грамнічную свечку, затым пакласці за абразамі ў чырвоным куце, і запальваць у час навальніцы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Месяц
Маладзік.
Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.07	21.24	16.17
Віцебск —	4.50	21.20	16.30
Магілёў —	4.57	21.14	16.17
Гомель —	5.01	21.03	16.02
Брэст —	5.24	21.38	16.14
Гродна —	5.32	21.31	15.59

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Кірылы, Панкрата, Фёдара.*

К. *Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



КАЛІ ЭНЕРГІЯ Б'Е ЦЕРАЗ КРАЙ

Па вуліцы Савецкай у Маларыце загарэўся дом. У хуткім часе следчыя ўстанавілі, што падпаліла яго 54-гадовая беспрацоўная з райцэнтра.

А ў Брэсце ў адным з дамоў па вул. Ясеневай 18-гадовы хлопец без усякай прычыны пачаў біць вокны. Хуліган выбіў восем шыбаў і быў затрыманы. Заведзены крымінальныя справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

САЛОМКА, ДЫ НЕ ТАЯ

што сцелюць там, дзе магчыма ўпасці. 31-гадовы жыхар Мазыра перавозіў у аўтамабілі ВАЗ-2108 каля 300 грамаў макавай саломкі. Ён быў затрыманы ў вёсцы Прудок Мазырскага раёна разам з пакетам, у якім знаходзілася нейкае рэчыва. Як паведаміла прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама, экспертыза пацвердзіла, што змесціва з'яўляецца наркотыкам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗБІЎ І ЗБЕГ

На вуліцы Дзянісаўскай насупраць дома № 45 аўтамабіль «Хундай Саната» збіў пешахода, які пераходзіў праезную частку на зялёны сігнал святлафора.

Як паведаміў інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Бруй, пешаход з чэрапна-мазгавой траўмай і адкрытым пераломам правай галёнкі дастаўлены ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Вадзіцель аўтамабіля ўцёк, кінуўшы машыну. Разбор па гэтым факце праводзяць праваахоўныя органы.

Усяго за мінулыя суткі ў Мінску зарэгістравана 71 дарожна-транспартнае здарэнне, з іх 3 — з пацярпелымі. Затрыманы 10 вадзіцеляў, якія кіравалі транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

МАРЫХУАНА Ў... ПАСЫЛЦЫ

Амаль 60 грамаў марыхуаны было выяўлена пры аглядзе ў адной з пасылак у папраўчай установе № 2 г. Бабруйска.

Праваахоўнікі высвятляюць асобу, якая накіравала гэту пасылку, пакуль жа вядомае месца адпраўкі — адно з лідскіх паштовых аддзяленняў. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «Незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў», за падобныя дзеянні прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін ад 8 да 13 гадоў, нават з канфіскацыяй маёмасці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3
Предмет аукциона (сведения о предмете аукциона, информация о земельном участке: площадь, срок аренды)	**Капитальное строение № 410/С-15286 (здание цеха платных услуг), часть капитального строения № 410/С-20365 (часть проездов асфальтобетонных площадью 96 кв. м) и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0776 га сроком на 50 лет**	**Капитальное строение № 410/С-15284 (пристройка к вспомогательному корпусу с подвалом), часть капитального строения № 410/С-20365 (часть проездов асфальтобетонных площадью 500 кв. м) и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,1837 га сроком на 50 лет**	**Капитальное строение № 410/С-15282 (хозяйственный склад), часть капитального строения № 410/С-20365 (площадка – асфальтобетон, ограждение – сплошные железобетонные панели, часть проездов асфальтобетонных площадью 242 кв. м) и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,2626 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	122 358,214	80 278,873	114 406,443
Сумма задатка, тыс. рублей	12 235,000	8 027,000	11 440,000
Место нахождения объектов	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Зенитчиков, 27		
Продавец недвижимого имущества	Дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 4» г. Волковыск Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», контактные телефоны: (8 01512) 2 14 41, 2 06 11		
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)		

1. Аукцион состоится **30 июля 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона по **28 июля 2009 года до 13.00**, кабинет 6.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549.

4. Решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

5. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды этого участка, возместить расходы, связанные с проведением данного аукциона, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка.

6. После совершения победителем аукциона названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

7. Подробная информация – в извещении о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете «Звязда» **от 5 июня 2009 г. № 102 (26460)**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.345 Індэкс 63850. Зак. № 3931. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ДЕПАРТАМЕНТ
ПО ЦЕННЫМ БУМАГАМ
Министерства финансов
Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
«14» июля 2009 г.
_____ Кулаженко В.Г.

белагропромбанк
традиции будущего

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц пятьдесят второго выпуска

1. Наименование эмитента:
открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»).

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 228 52 06, факс (017) 228 53 01
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

3. Сумма зарегистрированного уставного фонда
Уставный фонд Банка составляет 3 828 635 046 000 бел. рублей.

4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации
Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках ОАО «Белагропромбанк» ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
Бухгалтерский баланс на 1 января 2009 года и отчет о прибыли и убытках за 2008 год ОАО «Белагропромбанк» опубликованы 31.03.2009 в газетах «Звязда» и «Рэспубліка».

5. Сведения о проведении открытой продажи облигаций пятьдесят второго выпуска

5.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о выпуске именных облигаций пятьдесят второго выпуска для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждено Наблюдательным советом Банка 18.06.2009, протокол № 18.

5.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций
Форма выпуска облигаций – бездокументарные (в виде записи на счетах).
Объем эмиссии облигаций составляет 100 000 000 000 (Сто миллиардов) белорусских рублей.
К открытой продаже предлагаются 100 000 (Сто тысяч) штук процентных облигаций.
Серия ОБ52, номера 000001 – 100000.
Вид облигаций – процентные, именные, неконвертируемые.

5.3. Номинальная стоимость облигации
Номинальная стоимость облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

5.4. Цель выпуска облигаций
Пятьдесят второй выпуск облигаций ОАО «Белагропромбанк» осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц для финансирования реального сектора экономики.

5.5. Период проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций осуществляется с 24.07.2009 по 23.10.2009 включительно, если больший срок не будет определен Правлением ОАО «Белагропромбанк».

5.6. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Первичное размещение (продажа) облигаций ОАО «Белагропромбанк» производится после согласования с Национальным Банком Республики Беларусь выпуска именных облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска именных облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже именных облигаций пятьдесят второго выпуска.
Первичное размещение облигаций осуществляется путем открытой их продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени и (или) в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.
В день начала реализации облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного купонного дохода за текущий купонный период со дня начала текущего купонного периода по день предшествующий фактической продаже облигации (включительно), рассчитываемой по следующей формуле:

$$Дкн = [\frac{Н \times Пд1}{100} \times \frac{Т1}{365}] + [\frac{Н \times Пд2}{100} \times \frac{Т2}{365}] + \ldots + [\frac{Н \times Пдn}{100} \times \frac{Тn}{365}],$$

где:
Дкн – величина накопленного купонного дохода;
Н – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, Пдn – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 4 (Четыре) процентных пункта;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней. При этом сумма Т1 + Т2 +…+Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления купонного дохода.
Владельцами облигаций могут быть только юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны в оплату облигаций перечислить денежные средства в безналичном порядке с текущих (расчетных) счетов. Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

5.7. Срок и порядок обращения облигаций
Срок обращения облигаций – 184 календарных дня с 24.07.2009 по 24.01.2010. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.
Совершение сделок купли-продажи облигаций прекращается за 5 (Пять) рабочих дней до даты выплаты купонного дохода за каждый купонный период в течение срока обращения облигаций, а также за 5 (Пять) рабочих дней до даты их погашения.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении юридическими лицами осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

5.8. Дата начала погашения облигаций
Дата погашения облигаций – 24.01.2010.

5.9. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Выплата дохода по облигациям производится ежеквартально (1 раз в 3 месяца) в виде купонного дохода:
за первый купонный период – 24.10.2009
за второй купонный период – 24.01.2010.
В случае, если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим.
Купонный доход по процентным облигациям за первый купонный период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты. День начала размещения облигаций и день выплаты дохода за первый купонный период считаются одним днем.
Купонный доход по процентным облигациям за второй купонный период начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период (дату погашения). День выплаты дохода за предшествующий период и день выплаты дохода за второй купонный период (дата погашения) считаются одним днем.
Выплата суммы купонного дохода производится на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций составляется на дату предшествующую 5 (Пяти) рабочим дням дате выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период.
Начисление купонного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций купонный доход не начисляется.
Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 4 (Четыре) процентных пункта.
Расчет купонного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дк = [\frac{Н \times Пд1}{100} \times \frac{Т1}{365}] + [\frac{Н \times Пд2}{100} \times \frac{Т2}{365}] + \ldots + [\frac{Н \times Пдn}{100} \times \frac{Тn}{365}],$$

где:
Дк – величина купонного дохода;
Н – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, Пдn – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 4 (Четыре) процентных пункта;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления купонного дохода.
При начислении процентного дохода принимается точное количество дней в году (365 дней).
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.
Облигации предоставляют своим владельцам право на получение купонного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость. Купонный доход выплачивается только за полностью истекшие купонные периоды.

5.10. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Досрочное погашение облигаций пятьдесят второго выпуска не производится.

5.11. Порядок погашения облигаций
Погашение облигаций производится 24.01.2010 на основании реестра владельцев облигаций. В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, равной номинальной стоимости. Проценты на сумму погашения в указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.
При погашении облигаций владельцу – юридическому лицу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигации, а также купонный доход за последний купонный период.

5.12. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Погашение облигаций производится на основании реестра владельцев облигаций, который составляется на дату, предшествующую 5 (Пяти) рабочим дням дате погашения облигаций (по состоянию на 18.01.2010).

5.13. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом да даты начала их погашения
В период обращения облигаций Банк может осуществлять выкуп облигаций у любого их владельца в следующие даты: 15.09.2009, 13.11.2009. Выкуп облигаций осуществляется Банком на биржевом рынке в соответствии с регламентом ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» по текущей стоимости на дату выкупа. Текущая стоимость облигаций рассчитывается по формуле:

С = Н + Дн,

где:
С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации,
Дн – накопленный процентный доход.
В случае, если день выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем по цене, приходящейся на дату выкупа. Проценты на сумму облигаций, выкупаемых Банком, за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
1. Не позднее пяти рабочих дней до даты выкупа предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
- наименование владельца облигаций;
- наименование ценной бумаги;
- количество облигаций, предложенных для продажи;
- наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, который будет осуществлять продажу облигаций в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»;
- согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в зарегистрированном Проспекте эмиссии;
- юридический адрес и контактные телефоны заявителя;
- подпись уполномоченного и печать юридического лица.
2. В день выкупа перевести указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», при отсутствии открытого раздела в Депозитарии ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» – заключить договор на депозитарное обслуживание.
В случае несоблюдения сроков предоставления заявления о выкупе и (или) не перевода облигаций на соответствующий раздел счета «депо» – выкуп облигаций не осуществляется.
Банк имеет право осуществлять:
- перепродажу приобретенных облигаций Банка по текущей стоимости;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

5.14. Дата и номер государственной регистрации облигаций (заполняется Департаментом по ценным бумагам)
Облигации пятьдесят второго выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 14.07.2009, регистрационный номер 5-200-02-0308.

6. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета выпуска облигаций Банк в срок не позднее 30 дней с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцам облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций.

7. Информация об обеспечении облигаций: состав и стоимость имущества, выступающего в качестве залога, основная сумма долга по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости (жилищное строительство), сведения о поручительстве, банковской гарантии
Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала банка (Указ Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

8. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата ОАО «Белагропромбанк» в течение их рабочего времени.

Адреса филиалов банка ОАО «Белагропромбанк» и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-05-17, 27-06-01
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 70-01-47
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87, 52-48-79
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 22-98-26
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-73
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 250-60-07, 228-59-02
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11

Заместитель
Председателя Правления **Г.А. Сысоев**
Главный бухгалтер **М.А. Шаповалова**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ШКЛОЎСКІЯ ЛІЛЕІ



Фота Аляксандра БЯЛЯСАВА.

У гарадскім парку ў цэнтры Шклова зацвілі водныя белыя лілеі.

Невялікая сажалка ў парку была зроблена напрыканцы XIX стагоддзя па ініцыятыве графа Аляксандра Крывашэіна. Менавіта яму за тым часам належаў Шклоўскі маёнтак. Міністр шляхоў зносінаў Расійскай імперыі шмат зрабіў для развіцця Шклоўшчыны: ён стаў ініцыятарам пабудовы кардоннай фабрыкі і пасадкі гарадскога парку.

Шклоўскаму парку сёння больш за сто гадоў, і ён па-ранейшаму прыцягвае шмат людзей. Сажалку ў парку ў наш час добраўпарадкавалі, а некалькі гадоў таму там з'явіліся белыя лілеі. Цяпер яны паразрасталіся па ўсім вадаёме.

Прыгожыя водныя кветкі радуюць вока шклоўцаў і гасцей горада. У спякотныя дні ў цяньку каля вады адпачываюць людзі. З альтанкі на беразе сажалкі прыступкі вядуць да самай вады, каб можна было бліжэй палюбавацца на шклоўскія лілеі.

Ілона ІВАНОВА.

Дзве даты

22 ліпеня

1812 год — падчас Айчыннай вайны каля вёскі Салтанаўка, пад Магілёвам, адбылася жорсткая бітва паміж палкамі 7-га пяхотнага корпуса генерала М.М. Раеўскага (15 тыс. чалавек) і французскімі войскамі корпуса маршала Л. Даву (26 тыс. чалавек). Атрымаўшы загад Баграціёна выбіць французаў з Магілёва, корпус Раеўскага 22 ліпеня адкінуў перадавыя часткі саперніка і перайшоў у наступленне пад Салтанаўкай. У адзін з момантаў бою, калі здавалася, што рускія войскі не вытрымаюць, генерал Раеўскі стаў на чале асноўных сілаў корпуса і павёў пяхоту ў атаку. Разам з ім ішлі яго сыны — старэйшы (Аляксандр, 16 гадоў) нёс сцяг Смаленскага палка, малодшы (Мікалай, 10 гадоў) ішоў поруч з бацькам. Страты французаў склалі каля 5 тыс. чалавек, рускіх — 3000 чалавек. Дзеянні корпуса Раеўскага, якія скавалі сілы саперніка, забяспечылі пераправу галоўных сілаў войска П.А. Баграціёна праз Днепр. На месцы бою ў 1912 годзе ўстаноўлена мемарыяльная капліца.

356 год да н.э. — гэта дата лічыцца днём нараджэння Аляксандра Македонскага, вялікага палкаводца.

Цытата дня:

«Найвышэйшая мудрасць — філасофствуючы, не падавацца філасафам, і жартам дасягаць сур'ёзнай мэты».

Плутарх (46—120), старажытнагрэчаскі філосаф і гісторык.

Усміхнёмся!

— Ты вымак і дрыжыш! Пачакай, я прынясу што-небудзь сухое і цёплае.
— Прынясі лепш моцнае і халоднае...

☺

А заляцаецца як хораша! Якія словы знаходзіць! Якія кветкі прыносіць! Проста хоць не выходзь за яго замуж ніколі!

☺

Прызыўная камісія:
— Ваша прозвішча?
— Ба... Ба-бах... Бабахін...
— У кулямётную роту!

☺

Ты, як сабе кольца ў пупок уставіла, стала рэальна на гранату падобная!

УКРАІНЦЫ МЯНЯЮЦЬ ПРОЗВІШЧЫ НА КАЛАЙДЭР І КЛІЧКО

Ва Украіне на працягу некалькіх гадоў захоўваецца тэндэнцыя да змяншэння колькасці ахвотных змяніць уласнае імя або прозвішча.

Згодна са статыстыкай органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану грамадзян, ва Украіне штогод мяняюць імя або прозвішча прыкладна 20—25 тыс. грамадзян, сёлета за паўгода — 8317 чалавек. Здараюцца неардынарныя выпадкі змянення прозвішча або імя. Так, з пачатку года ва Украіне зарэгістраваны змяненні прозвішчаў Міраншнічэнка на Максвел, Калінніка ў на Емен, Лажычка на Луус, Гаўрысь на Калайдэр. Мяняліся таксама імёны: Аляксандра на Сумейра, Аляксандр на Велі, Вольга на Эндарфіна, Мар'яна на Дэленіка, Арцемій на Тыгран, Ірына на Лііргміліс.

Акрамя таго, зарэгістраваны выпадкі адначасовага змянення прозвішча і імя: Мацюк Таццяна на Бафет Арыяна, Лаўранчук Лена на Блум Молі, Капачук Раіса на Санці Рыта, Шніцэр Сільвестр на Крэйцэр Вітас.

Аднак існуе і зваротная тэндэнцыя, калі незвычайныя імёны грамадзяне хацелі замяніць традыцыйнымі, напрыклад: Эдэм на Дзмітрый, Салюція на Мар'яна, Фаўн на Аляксандр. Найбольш распаўсюджанай прычынай для змянення з'яўляюцца немілагучнае імя або прозвішча. Напрыклад, з пачатку года зарэгістраваны змяненні прозвішчаў Чарвяк на Шаманскі, Козел на Веліканіч, Песік на Новік, Крывій на Прынцэўскі, Глухій на Сірык, Насатый на Паскарык, Губа на Віткоўская, Шахрай на Даль і інш.

Традыцыйным для змянення імя і прозвішча з'яўляецца таксама імкненне асобных грамадзян стаць поўнай цёзкай вядомых ва Украіне людзей. Напрыклад, зарэгістравана змяненне імёнаў Паўлава Вікторыя на Ахматава Ганна, Русін Алег на Юшчанка Віктар, а Букавец Віктар пасля змянення ўласнага імя стаў Уладзімірам Клічко.

Кар. БЕЛТА.

Администрация Центрального района г. Минска приглашает жителей района с 31.07.2009 по 14.08.2009 принять участие в общественном обсуждении проекта строительства многоэтажного жилого дома по пр. Машерова в г. Минске (заказчик — СООО «Белинтер-Роба»).

Представление экспозиции состоится в фойе администрации Центрального района 31.07.2009 в 16.00.

Ознакомиться с экспозицией можно с 31.07.2009 по 14.08.2009 в фойе администрации Центрального района по адресу: ул. Мельникайте, 6, 3-й этаж, ежедневно с 9.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 16.45; обед с 13.00 до 14.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Письменные замечания и предложения направлять по адресу: ул. Мельникайте, 6, фойе (ящик для предложений).